МОГІЛКІ, КАЛОДЗЕЖ, КРЫНІЦА ЎЛАСНЫМІ РУКАМІ

МС

ЛЕСАПІЛЬНЯ РАЗЛАДУ: ПАМІЖ ЦІШЫНЁЙ І ГРАШЫМА

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ЛЮТАГА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 40 (29154)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Населеныя пункты, дзе захоўваецца дынаміка і пражывае каля 200 дзяцей, трэба падтрымліваць. Значыць, людзі там хочуць жыць, у тым ліку і моладзь. Дзяржава павінна забяспечваць мінімальны стандарт: даступнасць дашкольнай установы, школы, культурнага цэнтра. Калі гэта будзе стварацца, людзі будуць затрымлівацца. Развіццё сельскіх рэгіёнаў — адзін з ключавых кірункаў дзяржаўнай палітыкі».

КАРАТКА

- Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг.
- **Будынак Дома друку ў Мінску прадалі за Br6,22 млн. Функцыянальнае прызначэнне нерухомасці вызначана як адміністрацыйна-дзелавое.**
- У прадпрыемстваў «Беллегпрама» ёсць запас у 550 тыс. медыцынскіх масак.
- **Дату правядзення «Еўрабачання-2020» могуць перанесці. Арганізатары могуць абмежаваць колькасць наведвальнікаў шоу ці наогул правесці яго ў пустых залах.**
- У Мінскай вобласці лепшая бальніца знаходзіцца ў Стоўбцах, лепшы ФАП — ва Уздзенскім раёне.
- **ЗША і Рэспубліка Карэя адкладаюць правядзенне сумесных ваенных вучэнняў з-за каранавіруса.**

ISSN 1990 - 763X

Мазаіка замкавай вежы

Не першы год удзельнічаюць у рэстаўрацыі і кансервацыі руін помніка дойлідства — Гальшанскага замка будаўнікі Уладзімір ЛІХАРАД і Андрэй СУХАДОЛЬСКІ. Яны працавалі на аднаўленні адной з замкавых вежаў, дзе ўжо праведены мулярскія і атынковачныя работы, узведзены шатрападобны дах. Цяпер майстры выкладваюць у вежы мазаічную падлогу, дэталі для якой выраблены паводле старажытнага замкавага ўзору.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Шчаслівай дарогі!

ПА РЭЙКАХ І НА КРЫЛАХ

Цягнік да Будапешта, самалёт да Вены

У прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася прэс-канферэнцыя на тэму «Усе дарогі вядуць у Беларусь: перспектывы развіцця пасажырскіх перавозак у краіне». Прадстаўнікі чыгункі і авіяцыі падзяліліся сваімі думкамі на гэты конт.

У Прагу — без перасадак

Усяго летась паслугамі чыгункі скарысталася амаль 80 мільёнаў пасажыраў, з іх 3,8 мільёна — у міжнародных зносінах, расказаў **першы намеснік начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі Аляксандр ДРОЖЖА.**

Ён адзначыў, што наша краіна мае чыгуначныя зносіны з усімі сваімі суседзямі. Але больш за ўсё рэйкамі мы звязаныя з Расіяй, дзе прысутнічае 30 пар міжнародных цягнікоў, з якіх 20 пар беларускага фарміравання. Усяго наша краіна мае прамую чыгуначную сувязь з 7 федэральнымі акругамі нашай суседкі, а каля 70 % перавозак міжнародных зносін ажыццяўляецца менавіта з Расіяй. За апошні год колькасць пасажыраў з гэтай краіны павялічылася ў два з паловай разы.

Таксама чатыры пары міжнародных цягнікоў наша краіна мае з Літвой, дзве пары — з Латвіяй, шэсць пар цягнікоў — з Польшчай. Акрамя гэтага, мы чыгуначным транспартам з Беларусі можам даехаць у Казахстан, Малдову, Германію, Францыю, Італію і Аўстрыю. «У канцы 2019 года пашырана сетка бесперасадачных зносін з краінамі Заходняй Еўропы, — калі канкрэтна, то з Варшавай». Таксама з'явіўся цягнік Брэст — Прага. Цяпер спецыялісты чыгункі працуюць з заходнімі партнёрамі з нагоды яго падаўжэння да Венгрыі.

СТАР. 3

Ведай нашых

Сем цудаў Беларусі ад Ганны Лісіцкай

На ўроках матэматыкі асіповіцкай настаўніцы вучні вандруюць па ўсёй краіне і падлічваюць эканамічны эфект ад сваіх падарожжаў

СТАР. 4

Ганна ЛІСІЦКАЯ да работы падыходзіць творча.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы будуем саюз, каб стварыць роўныя ўмовы для кампаній, прадпрыемстваў і людзей»

Краіны ЕАЭС падпішуць стратэгію інтэграцыі да 2025 года

Старшыня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу са старшынёй Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Міхаілам Мясніковічам.

Фота БелТА.

«Мы застаёмся, як заўсёды, прыхільнікамі інтэграцыі — рэальнай інтэграцыі, без прымушэнняў. Мы заўсёды ініцыявалі рэальную інтэграцыю: нашых дзяржаў Расіі і Беларусі, эканомік, жыцця людзей і гэтак далей, захоўваючы суверэнітэт і незалежнасць», — першае, што падкрэсліў кіраўнік дзяржавы падчас гутаркі. Прэзідэнт адзначыў, што збліжэнне мусіць будавацца на класічных прынцыпах, якія вядомыя ва ўсім свеце.

На сустрэчы Аляксандр Лукашэнка праанансаваў падпісанне ў маі ў Мінску стратэгіі інтэграцыі да 2025 года.

«Канешне, мы мусім прапанаваць сур'ёзны варыянт гэтай стратэгіі, без усякіх там агаворак, калі жадаем пабудаваць наш саюз на рэальных прынцыпах інтэграцыі (а мы іх павінны ў гэтай стратэгіі яшчэ раз нагадаць, калі нехта забыў). І самае галоўнае, што трэба прадугледзець, — каб не атрымалася, што збяромся ў снежні 24-га года — і як заўсёды: «мы аб нечым не дамовіліся, нехта не гатовы працаваць па адзіных прынцыпах нафты, газу, аграрнай, алкагольнай прадукцыі...» — выказаў занепакоенасць Прэзідэнт.

Таму, лічыць ён, па рашэнні ўсіх інтэграцыйных пытанняў трэба ісці паступова. Для Беларусі асабліва важны адзіны рынак нафты і газу.

Беларускі лідар не стаў хаваць, што свабод, якія калісьці дэкларавaліся пры падпісанні Дагавора аб стварэнні ЕАЭС, сёння практычна няма. Ці ёсць, але далёка не ў поўным аб'ёме. Пытанне асабліва актуальнае для свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, рабочай сілы і капіталу.

«Гэта аснова, фундамент будаўніцтва нашага саюза — мы дагэтуль гэтага не маем. І ведаеце чаму? Пафігізм. Які засноўваецца на поўнай абыякавасці асобных дзяржаў, ***іншыя бачаць сябе ў іншым саюзе, проста целяпаюцца ў ЕАЭС*** і чакаюць нейкага зручнага моманту, каб выскачыць з яго», — выказаў меркаванне Прэзідэнт.

Перашкоды самім сабе

Прэзідэнта абураюць 66 выключэнняў і бар'ераў, якія цяпер дзейнічаюць у саюзе.

«Які інтарэс Беларусі ці таго ж Кыргызстана (ён у самай складанай сітуацыі), Арменіі ў гэтым саюзе? ***Што нас трымае ў гэтым саюзе, калі навокал перашкоды, бар'еры і выключэнні?*** Мы будуем саюз, каб стварыць роўныя ўмовы для кампаній, прадпрыемстваў і людзей. Але за пяць гадоў усё больш і больш адыходзім ад гэтых роўных умоў, пачынаецца манапалізм», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У прыклад Прэзідэнт прывёў пастаўкі ў нашу краіну прыроднага газу па кошце 127 долараў: «Нам кажуць, гэта добра. Вы ведаеце, пачым Польшча сёння атрымлівае амерыканскі газ, які там трэба перавесці ў вадкі стан, перавезці сюды, рэгазіфікаваць і па трубе паставіць? 90 долараў! Мы расіянам кажам, што летась з улікам ператаможкі нафты было 110—111 долараў. Не, «давайце 127». На біржы сёння ўжо ніжэй за сто долараў таргуецца газ».

Нелагічнай выглядае і спроба прадаць нафту па сусветнай цане і запатрабаваць прэмію з кожнай тоны. «Дык прэмію плацяць тым, хто купляе. Калі мы купляем тавар, матывуйце, — вы нам прэмію дайце. Не. Чаму? ***Таму што няма правіл нармальных, права сілы — нахіліць, прымусіць.*** І кожны дзень у сродках масавай інфармацыі атакі: «Лукашэнка нечага хоча». Ды я ўжо нічога не хачу, акрамя таго, пра што мы дамовіліся», — сказаў лідар дзяржавы.

У прыватнасці, ён нагадаў аб прапанове Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна аб кампенсацыі страт ад зніжэння пошліны. «Не паспелі аб гэтым дамовіцца, увечары ўжо міністры па-свойму трактуюць нашы дамоўленасці, двух Прэзідэнтаў. Бяру запіс размовы: дакладна, як той казаў, чорным па белым, была дамоўленасць, што розніцу нам кампенсуюць, то-бок фінансава мы застанёмся на ўзроўні мінулага года. Гэтага няма. Ну што гэта за саюз такі?» — задаў чарговае рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым стрыжнем Еўразійскага эканамічнага саюза ён назваў менавіта адносіны Беларусі і Расіі. «Гэта паказальна, гэта маяк. ***Мы ж не просім чагосьці ў свайго галоўнага саюзніка, як і ў іншых. Мы самі здольныя зарабіць і больш аддаць,*** як гэта было ў савецкі час. Беларусь заўсёды больш аддавала ў саюзны бюджэт, чым адтуль атрымлівала. І мы гатовыя сёння ў гэтым кірунку працаваць, але гэта мусіць быць прынцыпова, шчыра і прыстойна», — падвёў вынік Прэзідэнт.

Больш ніякіх бар'ераў

Дамовіцца і працаваць, аб'ядноўвацца на справе і паказваць прыклад тым краінам, якія не ўступілі ў саюз, — такім як Узбекістан, Таджыкістан, Украіна, — такія перспектывы для ЕАЭС бачыць Аляксандр Лукашэнка. А Беларусь падчас свайго старшынства мусіць шчыра і адназначна ўносіць адпаведныя прапановы.

Міхаіл Мясніковіч, які ўжо на новай пасадзе наведаў усе краіны Еўразійскага эканамічнага саюза, расказаў журналістам аб праблемах ЕАЭС і магчымых шляхах іх вырашэння. «Ёсць вельмі вялікі разрыў пазіцый палітыкаў і непасрэдна на экспертным узроўні, які ўдзельнічае ў фарміраванні нарматыўна-прававой базы Еўразійскага эканамічнага саюза. Будзем рабіць так, каб мінімізаваць гэты разрыў. Трэба звяртаць увагу вышэйшых службовых асоб на безумоўнае выкананне дамоўленасцяў, якія маюць месца на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў», — лічыць старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Па словах Міхаіла Мясніковіча, Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову аднамомантна ўсім краінам скасаваць бар'еры і абмежаванні ў гандлі і даць установы ўрадам не ствараць новых. Таксама кіраўнік ЕЭК паведаміў, што праект Стратэгіі развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза да 2025 года знаходзіцца на фінальнай стадыі ўзгаднення.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ААН заявілі пра пагрозу неабмежаванай ядзернай канкурэнцыі

Пагроза неабмежаванай ядзернай канкурэнцыі становіцца рэальнай упершыню з 1970-х гадоў. Пра гэта заявіла намеснік генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і высокі прадстаўнік па пытаннях раззбраення Ідзумі Накаміцу на пасяджэнні Савета Бяспекі па падрыхтоўцы да агляднай канферэнцыі 2020 года па Дамове аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. «Мы з'яўляемся сведкамі таго, што было названа якаснай ядзернай гонкай — заснаванай не на колькасці, а хуткасці, дакладнасці і магутнасці ўзбраенняў, — заўважыла прадстаўнік ААН. — Адносіны паміж дзяржавамі, асабліва ядзернымі, цяпер падарваныя».

Пуціну прапаноўвалі выкарыстоўваць двайніка, але ён адмовіўся

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін прызнаўся, што ідэя прыцягнуць двайніка для яго бяспекі ўзнікала, але ён ад яе адмовіўся. Пра гэта прэзідэнт распавёў у інтэрв'ю ТАСС для праекта «20 пытанняў Уладзіміру Пуціну». «[Ідэя] узнікала, але я адмовіўся ад двайнікоў, — адзначыў ён. — Гэта было ў самыя цяжкія часы барацьбы з тэрарызмам». Паводле яго слоў, у пачатку 2000-х гадоў гучалі прапановы, каб дублёр замяняў расійскага лідара на мерапрыемствах у месцах, дзе кіраўніку дзяржавы знаходзіцца небяспечна. Аднак, паводле яго слоў, ён ніколі не выкарыстоўваў двайнікоў. Пытанне аб тым, ці ёсць у Пуціна двайнік, кіраўнік дзяржавы і журналіст, які браў у яго інтэрв'ю, выявілі ў якасці аднаго з найбольш папулярных запытаў пра расійскага лідара ў інтэрнэце.

Саудаўская Аравія забараніла ўезд паломнікаў

Саудаўская Аравія пайшла на беспрэцэдэнтны крок. Улады краіны часова забаранілі ўезд паломнікаў, якія імкнуцца наведаць святыя месцы ў Меццы і Медыне. Пра гэта паведаміў МЗС каралеўства і патлумачыў гэта неабходнасцю прадухіліць завоз каранавіруса ў краіну. Таксама часова забаронены ўезд па турыстычных візах для грамадзян дзяржаў, дзе ўжо зафіксаваны ўспышкі COVID-19 і ў якіх ёсць рызыка яго далейшага распаўсюджвання. Акрамя таго, улады абмежавалі ўезд і выезд для суграмадзян і жыхароў краін-удзельніц Савета супрацоўніцтва краін Персідскага заліва. Эр-Рыяд зноў падкрэслівае, што выкарыстоўвае ўсе меры, якія прымаюць іншыя краіны для стрымлівання распаўсюджвання інфекцыі, адзначаецца ў заяве міністэрства. Associated Press нагадвае, што пакуль у дзяржавах Блізкага Усходу пацверджана звыш 220 выпадкаў заражэння, большасць з іх — у Іране.

У ліку найлепшых

Чым парадуюць таленавітыя і крэатыўныя?

2-3 сакавіка БРСМ у дзявяты раз правядзе ў Мінску фінал рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі».

У першы дзень увазе ўдзельнікаў Гранд-фіналу арганізатары прапануюць Speech-сесію па запуску праекта на рынку, пошуку інвестараў і пабудове матывацыйнай стратэгіі ў камандзе з выступленнем вядучых спікераў і бізнес-трэнераў ад IT-акадэміі адукацыйнага цэнтра праграмавання і высокіх тэхналогій і ТАА «ІнКата» і ўпершыню — інтэлектуальную віктарыну «ПРА100 QUIZ». Выніковыя падзеі разгорнуцца ў другі дзень. Удзельнікі Гранд-фіналу будуць абараняць свае распрацоўкі перад экспертным Саветам.

Будуць вызначаны 20 пераможцаў у дзесяці намінацыях у двух узроставых катэгорыях: першая — навучэнцы, другая — студэнцкая і працоўная моладзь, маладыя навукоўцы. Дзесяць аўтараў найбольш перспектыўных праектаў атрымаюць грашовыя сродкі ў памеры да 40 тарыфных ставак на распрацоўку бізнес-планаў для іх далейшага ўдзелу ў штогадовым рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў.

Арганізатарамі рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі» выступаюць БРСМ, Міністэрства адукацыі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Блізкая ўлада

ЗІМА СЫХОДЗІЦЬ. А ПРАБЛЕМЫ?

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператорчасці, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу 29 лютага з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ . Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

В объявлении ОАО «Обувьторг» об общем собрании акционеров 20 марта 2020 года, опубликованном в газете «Звязда» № 32 (29146) от 18 февраля 2020 г., последний абзац читать в следующей трактовке: Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра на 20 февраля 2020 года.

УНП 100262652 **Наблюдательный совет.**

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Лысенку Максіму Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.

Упусцілі медаль

Чэмпіянат Еўропы па біятлоне прадоўжыўся эстафетамі

Другі спаборніцкі дзень пачаўся з адзіночнай змешанай эстафеты, у якой прынялі ўдзел 27 камандаў. Беларусь прадставілі Ганна Сола і Віктар Крыўко. Усё пачалося для нашай каманды з ідэальнай стральбы Ганны на лёжцы, але настрой рэзка змяніўся ўжо пасля другога падыходу да стрэльбішча, дзе Сола дапусціла восем промахаў, а потым яшчэ атрымала дзве хвіліны штрафу, таму што забылася прабегчы адно з штрафных колаў. Вынік — 13-е месца зборнай Беларусі.

Увечары біятланісты выйшлі на старт змешанай эстафеты, дзе ўдзел прынялі 22 каманды. Гаспадары турніру былі прадстаўлены Дзінарай Алімбекавай, Ірынай Крыўко, Антонам Смольскім і Сяргеем Бачарнікавым.

Пасля двух жаночых этапаў зборная Беларусі лідзіравала ў прамежкавым пратаколе, і Дзінара, і Ірына справіліся выдатна са сваёй задачай.

— Сёння была вельмі цяжкая траса, да таго ж я адчувала няўпэўненасць пасля мінулай эстафеты, трошкі баялася ехаць на лёжку, таму не кідалася ў гонку з самага пачатку, — адзначае Ірына Крыўко. — Вецер пастаянна дзьмуў з рознай сілай, таму на стрэльбішчы таксама было не вельмі камфортна. Перад гонкай вельмі доўга прыстрэльвалася, здавалася, што не хопіць нават паўгадзіны.

Антон Смольскі, нягледзячы на промахі на лёжцы, здолеў захаваць беларускую перавагу. А вось герой першага дня Сяргей Бачарнікаў заваліў стральбу на апошнім агнявым рубяжы, зарабіўшы штрафны круг, і фінішаваў толькі чацвёртым. Перамогу святкавала каманда Украіны.

Сёння на турніры выхадны. На 29 лютага запланаваны спрынтарскія гонкі ў жанчын і мужчын. У апошні дзень спаборніцтваў, 1 сакавіка, адбудуцца гонкі пераследавання.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Змітрок Бядуля вярнуўся на Радзіму

УЧОРА парэшткі пісьменніка вярнуліся ў Беларусь з далёкага Казахстана. Пытаннямі перазахавання Змітрака Бядулі ў Мінску займаецца са згоды яго родных Фонд Марыі Магдалены Радзівіл (Швейцарыя), які ўзначальвае яго старшыня і член Кансультацыйнага савета па пытаннях беларусаў за мяжой пры МЗС Беларусі Аляксандр САПЕГА.

Помнік з магілы пісьменніка таксама быў дэманціраваны, усе яго элементы прывезены ў Беларусь і будуць перададзены Дзяржаўнаму музею гісторыі беларускай літаратуры. Гэтая ўстанова з'яўляецца і выступае зацікаўленым партнёрам Фонду і садзейнічае рэалізацыі праекта.

Аляксандр Сапега расказаў, што настаяцелем царквы на мясцовых могілках была выказана прапанова захаваць памяць пра Змітрака Бядулю ў Казахстане, адкрыць мемарыяльны знак на тэрыторыі могілак. Магчыма, гэта будзе мемарыяльная дошка на сценах той самай царквы, дзе адслужылі паніхіду перад вяртаннем праху пісьменніка на родную зямлю.

Сын пісьменніка Яфім Самуілавіч Плаўнік, які жыве ў Мінску, не хаваў эмоцый:

— Некалі, амаль 80 гадоў таму, я хаваў свайго бацьку. Усю цяперашнюю падзею я не ўспрымаю як пахаванне, для мяне гэта яго вяртанне на Радзіму... Вельмі добра памятаю тое пахаванне ва Уральску. Коласаўскі тэатр з Віцебска быў тады там на гастролях, і яны ладзілі яго пахаванне. Калі мяне, малога, вялі развітвацца з татам, то мне трэба было караскацца па прыступках, што былі зроблены і вялі да труны... Я вельмі ўдзячны Аляксандру Сапегу, бо разумею, якую вялікую працу ён зрабіў. Да гэтага наша сям'я спрабавала правесці перазахаванне шэсць разоў, і вось толькі на сёмай спробе нам гэта ўдаецца.

Навіны аб перапахаванні пісьменніка Змітрака Бядулі на тэрыторыі Беларусі з'яўляліся ў прэсе яшчэ ў пачатку года. Аднак падрабязнасці наконт таго, калі і дзе будзе праведзена перапахаванне, пакуль яшчэ не вядомыя. Дакладна заяўлена, што месца для гэтага знойдуць у Мінску.

Алена ДРАПКО.
Фота з сайта Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, аўтар Юрый КАМІСАРАЎ.

Надвор'е

Мокры снег і дождж

Ды ў нас уся зіма была такой, калі ад мінуса да плюса адзін крок

Калі тры месяцы не было сапраўднай зімы, то цяпер ужо і не трэба. На парозе вясна. А першыя дні яе ў нашай краіне пачнуцца з дажджу і мокрага снегу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сіноптыкі адзначаюць, што зіма ў гэты сезон была анамальна цёплай ва ўсім Паўночным паўшар'і. Эксперты падлічылі, што такога яшчэ не было ні разу за ўвесь перыяд інструментальных назіранняў. Лютым у нашай краіне таксама аказаўся вельмі цёплым: сярэднямесячная тэмпература паветра на 5-7 градусаў перавышае норму. Упершыню ў нашых шыротах зіма была практычна без снегу.

У суботу будзе воблачна з праясненнямі. Пройдзе невялікі кароткачасовы мокры снег. Уначы і раніцай магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да 7 градусаў марозу, удзень — ад мінус 1 па паўночным усходзе да 6 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Першы дзень каляндарнай вясны практычна нічым не будзе адрозніваць (па тэмпературы так дакладна) ад любога дня гэтай зімы. У ноч на нядзелю ва ўсходняй частцы краіны надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Трохі пазней, ужо раніцай на захад Беларусі з тэрыторыі Польшчы перамесціцца атмасферны фронт, які, рухаючыся на ўсход, на працягу дня будзе фарміраваць надвор'е ў краіне. Таму на пачатку сакавіка будзе пераважаць воблачнасць. Уначы пераважна па захадзе, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымыя слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, удзень — 1-7 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня мы апынемся ў зоне атмасферных франтоў і цёплых паветраных мас, якія перамяшчаюцца з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Часта будуць ісці ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу. На працягу сутак пераважна будуць трымацца плюсавыя тэмпературы. У першай палове наступнага тыдня па поўдні краіны тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны будзе падымацца да 10-12 градусаў цяпла. Вясна...

Сяргей КУРКАЧ.

ПА РЭЙКАХ І НА КРЫЛАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыялісты айчыннай чыгункі плануюць актыўна пашыраць сувязь з Украінай. Разглядаецца пытанне прызначэння альбо цягніка, альбо бесперасадачных вагонаў, якія будуць рухацца з Віцебска ў Белгарад-Днястроўскі. У планах таксама пашырыць маршрут да Львова шляхам арганізацыі парытэтнага руху.

Сёння, паводле інфармацыі прадстаўніка БЧ, у Львоў ходзіць адзін цягнік беларускага саставу. Украіна пакуль не ідзе насустрач беларускаму боку, але вядуцца сумесныя работы над тым, каб з'явіўся яшчэ адзін цягнік. Усяго ў зносінах з Украінай у нас сёння арганізаваны рух пяццю парамі цягнікоў.

Кожны чацвёрты білет — электронны

Сёння ў ведамстве БЧ практычна цалкам гатовыя абслугоўваць усіх пасажыраў па электронных праязных дакументах. «Галоўнае, — адзначае Аляксандр Дрожжа, — каб гэта было зручна кліентам, каб пасажыр да гэтага прывык і карыстаўся сэрвісам». Усяго летась праз сайт дарогі прададзена больш за тры мільёны электронных праязных дакументаў — гэта 25 % ад агульнай колькасці рэалізаваных білетаў на цягнікі з пранумаравanымі месцамі. Гэта значыць, кожны чацвёрты дакумент, які набылі пасажыры, быў электронны.

Летась праведзена сур'ёзная работа па ўдасканаленні на сайце аддзела «Паслугі пасажырам». «Мы распрацавалі і ўкаранілі мабільную праграму для куплі білетаў, прычым праз яе можна набыць білет не толькі на цягнік з пранумаравanымі месцамі, але і з непранумаравanымі, гэта значыць на цягнікі рэгіянальных напрамкаў. У выніку доля электронных праязных у агульнай колькасці прададзеных білетаў за студзень 2020 года вырасла да 30 %, — паведаміў першы намеснік начальніка пасажырскай службы. — Мы заклікаем сваіх кліентаў актыўна карыстацца гэтым сэрвісам, гэта зручна, хутка, сучасна і не трэба стаяць у чэргах».

Практычна ўсе цягнікі маюць электронную рэгістрацыю. «Засталося літаральна некалькі саставаў, якія яе не маюць. Гэта, на жаль, цягнікі з Украінай. Але ў гэтым годзе мы гэтае пытанне з украінскімі калегамі абавязаны вырашыць».

Сёлета будзе працягнутая работа па забеспячэнні магчымасці аплаты паслуг чыгункі непасрэдна па шляху руху па безнаяўным разліку. Цяпер разлічыцца за гарбату, печыва і бялізну ў цягніку можна будзе з дапамогай банкаўскай карткі не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і за яе межамі.

Цягнікі лакаматыўнай цягі — толькі ўначы

А ўсё таму, што вырашылі працягнуць практыку адмовы ад такіх цягнікоў у дзённы час. Узамен звыклых плацкартаў на лініях з'яўляецца ўсё больш маторвагонных саставаў.

— Мы спрабуем зрабіць цягнікі зручнымі і камфортнымі, — падкрэсліў прадстаўнік БЧ. — Цяпер па Беларусі актыўна ездзяць электра- і дызель-цягнікі Stadler і Pesa — усяго 34 саставы. Летась набыты тры новыя дызель-цягнікі Pesa шасцівагоннай кампаноўкі. Са снежня яны курсіруюць у напрамку Мінск — Віцебск. Цяпер шлях паміж двума гэтымі гарадамі займае тры гадзіны. Часам трохі больш — у залежнасці ад часу сутак.

Зусім хутка парк чыгункі папоўніцца яшчэ трыма такімі цягнікамі. Саставы будуць абслугоўваць лініі Мінск — Магілёў і Мінск — Гродна. Гэтую ідэю плануем рэалізаваць ужо ў 2020 годзе.

Пашыраем геаграфію палётаў

Нацыянальны авіяперавозчык рыхтуецца асвоіць сёлета адразу некалькі напрамкаў. У якія новыя аэрапорты паляцяць беларускія самалёты, расказала **начальнік службы маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці «Белавія» Кацярына РАДЗІШЭЎСКАЯ.**

Яна адзначыла, што ў «Белавія» дастаткова развітая сетка рэгулярных маршрутаў. Нашы самалёты лётаюць у 55 аэрапортаў 39 краін свету. Летась упершыню ў гісторыі авіякампаніі гадавы пасажырапатак перавысіў чатыры мільёны чалавек. Гэта стала магчыма дзякуючы гнуткай тарыфнай палітыцы і развіццю геаграфіі палётаў.

Летась было адкрыта адразу некалькі новых напрамкаў — рэгулярныя рэйсы ў Талін, Мюнхен. «Увесну мы плануем адкрыць уласны штодзённы рэгулярны рэйс у Вену. Таксама ёсць намер зрабіць рэйсы ў Актау (Казахстан), іспанскі Рэус і сталіцу Узбекістана Ташкент», — адзначыла Кацярына Радзішэўская.

Летась кампанія набыла шэсць самалётаў: два Boeing 737-800 і чатыры Embraer. Сёлета ў красавіку чакаецца прыбыццё яшчэ аднаго Embraer у рамках падпісаных раней кантрактаў. Акрамя таго, нядаўна з лізінгавай кампаніяй падпісана пагадненне на пастаўку трох Embraer новага пакалення. Першы сучасны лайнер плануюць атрымаць у снежні. Самалёты гэтага тыпу вельмі палюбіліся пасажырам дзякуючы камфорту.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

З машыны прадпрымальніка скралі $50 тысяч

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Міншчыны затрымалі 40-гадовага жыхара Фаніпаля па падазрэнні ў крадзяжу буйной сумы валюты з аўтамабіля.

Напярэдадні ў Стаўбцоўскае РАУС звярнуўся 40-гадовы мясцовы жыхар. Ён паведаміў, што невядомыя ноччу скралі з яго аўтамабіля «BMW X6» каля $50 тысяч, якія ляжалі ў пакеце на заднім сядзенні. Сышчыкі высветлілі, што ўладальнік аўтамабіля прыехаў дадому з Мінска і прыпаркаваў аўто ў двары. У салоне засталіся ляжаць каля $70 тысяч: большая частка ў пакеце і каля $20 тысяч у сумцы. Іншамарка абсталявана сістэмай бесключавога доступу, што прадугледжвае аўтаматычнае адкрыццё і закрыццё цэнтральнага замка пры збліжэнні або аддаленні ключа. Мабыць, прылада не спрацавала і машына засталася незачыненая, расказалі ў галоўным упраўленні крымінальнага вышуку МУС.

Гэтым скарыстаўся падазраваны: тузануў за ручку, і дзверы іншамаркі адчыніліся. Знойдзены пакет з валютай ён забраў і з радасці больш нічога не шукаў, таму сумка з меншай сумай засталася некранутай.

На след меркаванага зламысніка аператыўнікам удалося выйсці на працягу сутак. Яго затрымалі раніцай па месцы жыхарства. У асабістым аўтамабілі былі знойдзены скрадзеныя грошы, а таксама пісталет, балаклава і металічная палка. Вядома, што ён раней не судзімы, працуе індывідуальным прадпрымальнікам у сферы рознічнага гандлю аўтазапчасткамі.

Па факце крадзяжу ў асабліва буйным памеры распачата крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сем цудаў Беларусі ад Ганны Лісіцкай

Хоць матэматыка ніколі не была маім любімым прадметам, па-добраму зайздрошчу вучням асіповіцкай школы № 3. Нават кабінет у іх не такі, як ва ўсіх: замест плакатаў з сухімі матэматычнымі формуламі — шмат рознакаляровай інфаграфікі з беларускімі краявідамі і нават рэцэптамі, спецыяльна адведзены куточак для жартаўлівых напамінаў пра тыповыя памылкі вучняў, на паўсцяны расцягнуўся загадкавы ланцужок з «матэматычна» афармленымі сэрцайкамі, і паўсюль, дзе толькі ёсць вольнае месца, картачкі для адукацыйных квэстаў. Тут яны праводзяцца рэгулярна. Усё, што знаходзіцца ў матэматычным кабінеце, — гэта вынік творчых пошукаў і знаходак Ганны Лісіцкай. Яна ў захапленні ад свайго прадмета і робіць усё, каб на ўроку не было сумна.

БЕЗ ТВОРЧАСЦІ Ў РАБОЦЕ НЕ МАГУ

Калі не лічыць двух гадоў у дэкрэтным адпачынку, працоўнага стажу ў Ганны Лісіцкай не болей за тры гады. Але гэта не перашкаджае ёй рэгулярна атрымліваць падзякі і дыпломы за прафесіяналізм і паспяховую падрыхтоўку дзяцей. У першы год сваёй работы яна атрымала перамогу ў раённым конкурсе настаўнікаў «Урок, якім я ганаруся». У дэкрэце брала ўдзел у рэспубліканскім конкурсе з міжнародным ухілам і атрымала дыплом за першае месца. Летась выйшла на другое месца ў абласным конкурсе «Таленты XXI стагоддзя», сёлета заняла другое месца на конкурсах «Патрыёт.by» і «ТэхналІнтэлект» з выхадам на рэспубліку. А яшчэ ў настаўніцы і яе вучняў шмат дыпломаў за перамогі ў міжнароднай анлайн-алімпіядзе «Фоксфард».

— Я вельмі люблю тое, што ніхто не робіць, — усміхаецца маладая жанчына. — З задавальненнем удзельнічаю ў конкурсах, бо яны стымулююць вывучаць нешта новае. А мне хочацца пастаянна развівацца. Калі няма творчай работы, я сумую. У мяне шмат матэматычных гульняў, нашмат цікавейшых за тыя, якія можна знайсці ў мабільніку. Мы спаборнічаем паміж сабой, паміж класамі. Дзеці нават пасля ўрокаў застаюцца, каб дарашыць тую ці іншую задачку і перамагчы саперніка.

ЗАДАЧКІ ДЛЯ ПАТРЫЁТАЎ

У дэкрэтным водпуску Ганна Лісіцкая дарэмна час не губляла. Даведалася, што Акадэмія паслядыпломнай адукацыі праводзіць конкурс «Сучасны ўрок матэматыкі», і вырашыла зрабіць нешта арыгінальнае.

— Згадала, што некалькі гадоў таму ў краіне быў абвешчаны конкурс на вылучэнне сямі цудаў Беларусі. Яны былі выбраныя яшчэ ў 2011-м, але ніякай падрабязнай інфармацыі на гэтую тэму ў інтэрнэце няма. І я выправіла гэты прабел. Даведалася, што сем абвешчаных цудаў — гэта Белавежская пушча, Бабруйская крэпасць, Сафійскі сабор у Полацку, Брэсцкая крэпасць, касцёл у стылі барока ў Будславе, Мірскі замак і возера Нарач. Сабрала поўную інфармацыю па гэтых аб'ектах і вырашыла крыху разбавіць гісторыю матэматыкай. Правяла анкетаванне, каб даведацца, на чым і як падарожнічаюць дзеці, што бяруць з сабой, якой ежы аддаюць перавагу ў падарожжах, якія сувеніры прывозяць, і ўсе гэтыя звесткі ўвяла ў разлікі. Усе цэны, якімі мы карыстаемся, рэальныя: вучні ідуць у краму, на пошту, на аўтавакзал, каб даведацца, што колькі каштуе — так цікавей працаваць. У нас ёсць варыянт для падарожжаў на прыватным аўто, аўтобусе — падстаўляеш лічбы ў формулу і падлічваеш. Па такім жа прынцыпе высвятляеш, колькі будуць каштаваць ежа, сувеніры, якія выдаткі давядзецца несці, каб паслаць па пошце сувенір сябру.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вучні любяць матэматыку за крэатыўнасць настаўніцы.

З гэтай работай настаўніца ўвайшла ў трыццатку найлепшых распрацоўшчыкаў урокаў для Беларусі. Болей чым з 400 (!) прэтэндэнтаў.

НА АСНОВЕ ДАЛЬТАН-ТЭХНАЛОГІЙ

Гэта спалучэнне кабінетнага навучання з адукацыйным працэсам, заснаваным на трох прынцыпах: свабода, самастойнасць, супрацоўніцтва. З дапамогай дальтан-заданняў вучні Ганны Лісіцкай знаёмяцца з гісторыяй роднага краю, запаўняюць таблічкі і ўводзяць адказы ў карткі.

— Мы выкарыстоўваем сэрвіс інтэрактыўных рабочых сшыткаў, дзеці іх запаўняюць і адразу ж правяраюць з дапамогай QR-кодаў. Тыя, хто справіўся з заданнем, у якасці бонуса атрымліваюць магчымасць здзейсніць віртуальнае падарожжа. Я адшукала іх у інтэрнэце і прымацавала да нашых заданняў. З іх дапамогай можна зазірнуць у любы куточак славутасці. Дзеці пасля такога прагляду прыходзяць на ўрок з адчуваннем, што рэальна наведалі той ці іншы аб'ект, — кажа настаўніца.

З дапамогай гугл-картаў яна аб'яднала ўсе тыя славутасці ў агульны плакат. Кожны з цудаў азначаны на ім кропкай, побач спасылкі на карысную інфармацыю.

Сама яна магістр фізіка-матэматычных навук. Прызнаецца, што заўсёды шукае нешта цікавае і новае. Пастаянна распрацоўвае спецыяльныя гульні і задачкі. Па сямі цудах, напрыклад, — у інтэрнэце

ёсць яе гульня на 2 каманды, якую можна запусціць нават з тэлефона. Усе свае наватарскія распрацоўкі Ганна Лісіцкая размяшчае на ўласным сайце, які таксама стварыла сама. Бо акрамя таго, што выкладае матэматыку, яна яшчэ і настаўніца інфарматыкі ў старэйшых класах. На сайце вучні могуць знайсці адказы на заданні, паўтарыць з дапамогай дыдактычных гульняў матэрыял. А тры гады таму яна стварыла нават электронны падручнік па тэме мностваў, збірала інфармацыю з розных крыніц. Гэту тэму толькі ўвялі ў школьную праграму, і ў падручніках амаль нічога па ёй не было. «А я ж магістр па тэме мностваў — гэта якраз было прадметам даследавання ў маёй дысертацыі», — усміхаецца яна. Цяпер падручнікі новыя, але распрацоўку можна выкарыстоўваць як дадатак.

— Наогул у мяне шмат распрацовак па ўсіх тэмах, — кажа Ганна. — Праходзім дробы, я складаю задачкі на дробы, працэнты — вылічваем працэнты. Вучань атрымлівае заданне, інструкцыю і выконвае сваю работу. Падобных распрацовак я больш нідзе не бачыла, таму на ўроках выкарыстоўваю выключна свае. Усе яны зроблены на аснове матэрыялаў, рэкамендаваных для самастойнай работы, і разлічаны на дзяцей рознага ўзроўню падрыхтоўкі.

Абавязкова напішыце пра нашу настаўніцу, раяць сямікласнікі, яна ў нас вельмі класная. Не стрымліваюся, каб не спытацца, а за што ж яе тут так любяць. «Яна прыдумвае для нас цікавыя заданні. А на святы за правільны адказ можна атрымаць нават цукерку», — усміхаецца Раман Старкоў. «А мне матэматыка падабаецца за інтэрактыўныя заданні і гульні. Вельмі люблю матэматыку», — дадае Насця Бандаравец. «Ганна Аляксандраўна вучыць нас думаць і разважаць, дае цікавыя заданні на сучасныя тэмы і праводзіць квэсты», — адзначае Ульяна Грапава.

СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

У школе працуе таксама муж Ганны Лісіцкай Марк Аляксандравіч і маці Алена Леанідаўна Янюк. Сужэнец таксама выкладае матэматыку і інфарматыку, а вось маці — настаўніца англійскай мовы. Нядзіўна, што дачка зрабіла для профільнага класа заданні на англійскай мове. Кабінеты дачкі і маці амаль побач, і гэта вельмі добры шанц даведацца, адкуль бяруцца таленавітыя вучні.

Алена Леанідаўна прызнаецца, што спачатку яна вучыла дачку працаваць, але цяпер вучыцца ў яе. Разам яны зрабілі мабільную праграму па англійскай мове з інтэрактыўнымі заданнямі на адпрацоўку лексікі.

— У падручніках не хапае інфармацыі, і яе трэба пастаянна шукаць у інтэрнэце, — кажа настаўніца. — Вось знайшлі інфармацыю пра «Беларусьфільм», дзецям было вельмі цікава. Для нас важна, каб у дзяцей было жаданне вучыцца, а не сядзець у мабільніку. Вунь бачыце, колькі ў нас картак на розныя тэмы. Усё аўтарскае. Мы з дачкой нават карцінкі вышываем па тэме. І шмат працуем у рэжыме анлайн. Дачка дапамагла распрацаваць сайт і мне. У кожнага з дзяцей там ёсць асабісты кабінет, дзе можна прасачыць свае вынікі або проста напісаць эсэмэску. У нас жа школа з інавацыйным падыходам.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Класныя навіны

КАЛІ АДШУМЯЦЬ ВЫПУСКНЫЯ?

Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года, і выпускных экзаменаў. Апошнія званкі для вучняў 9 і 11 класаў прагучаць 30 мая. Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў Міністэрства адукацыі рэкамендуе правесці 10—11 чэрвеня.

З 1 да 9 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены на II і III ступенях навучання.

Выпускнікі 11 класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (па выбары) і матэматыцы пройдуць 1, 3 і 5 чэрвеня. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца па радыё і тэлебачанні, а таксама іх размесцяць на партале Міністэрства адукацыі. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па адрозных заданнях і тэкстах. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць вусны экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку пісьмова. Даты правядзення пісьмовых экзаменаў 2, 4 і 9 чэрвеня.

Ва ўстановах адукацыі, дзе навучанне і выхаванне вядзецца на польскай і літоўскай мовах, для навучэнцаў 9 і 11 класаў праводзяцца выпускныя экзамены ў пісьмовай форме па мове нацыянальнай меншасці: 21 мая — у 9 класах і 22 мая — у 11 класах.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пры правядзенні выпускных экзаменаў у пісьмовай форме (за выключэннем выпускнога іспыту па матэматыцы) у класах інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца дзве экзаменацыйныя камісіі і выдзяляюцца два асобныя памяшканні для правядзення выпускных экзаменаў.

У 2019/2020 навучальным годзе завяршаюць навучанне адзінаццацікласнікі, якія першыя ў рамках вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» асвойвалі адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых). Гадавая адзнака па прадмеце «Працоўнае навучанне» ім будзе выстаўляцца як сярэдняе арыфметычнае адзнак, атрыманых па выніках кожнай чвэрці. У атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі выстаўляецца гадавая адзнака па працоўным навучанні, атрыманая ў XI класе. Калі навучэнцы адзінаццатых класаў засвоілі ў поўным аб'ёме змест праграмы прафесійнай падрыхтоўкі, то яны могуць здаць кваліфікацыйны экзамен, які не з'яўляецца абавязковым. Адзнака на кваліфікацыйным экзамене не ўплывае на адзнаку, выстаўленую ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне».

Да кваліфікацыйнага экзамену дапускаюцца навучэнцы, якія выканалі ў поўным аб'ёме патрабаванні вучэбна-праграмнай дакументацыі і маюць выніковую адзнаку па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне», не ніжэйшую за тры балы. Пры ўмове паспяховай яго здачы выпускніку выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору аб прысваенні яму кваліфікацыйнага разрада (класа, катэгорыі) па прафесіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

13 марта 2020 года в 14.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».

Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1. О совершении сделки с аффилированным лицом Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 6 марта 2020 г. по 12 марта 2020 г. (время работы с 8.30 до 17.30) либо 13 марта 2020 г. по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-45-66.

Дата формирования реестра владельцев акций и список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров 5 марта 2020 г.

Регистрация участников собрания с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет.

УНП 300000398

ОАО «МНИПИ» 26 марта 2020 г. в 14.30 проводит очередное общее собрание акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2019 году и основных направлениях деятельности на 2020 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, отчета о прибылях и убытках, распределения прибыли и убытков Общества за 2019 год.
5. Об утверждении распределения и использовании чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2019 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2020 год.
7. О внесении изменений в Устав Общества.
8. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
9. Избрание членов наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится в ОАО «МНИПИ» по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 73.

Регистрация акционеров 26.03.2020 г. с 13.30. При себе иметь документ, удостоверяющий личность. С материалами по вопросам повестки дня можно ознакомиться по месту нахождения Общества, телефон 270 08 00.

УНП 100512859

ПОШУКІ ШЧАСЦЯ

Гэта гісторыя — з маёй маладосці. Даўно яна была, але ж помніцца.

...У пакоі інтэрната нас чацвёра: Лена і Валя — ткачыхі, ім па 25, мы з Анютай — прадзільшчыцы, мне 18, Ані на тры гады больш, але ж змены ў нас супадаюць, і мы ходзім парачкай. Хлопцы тады — як галовы не скруцяць, бо Анюта прыгожая, статная, любіць і ўмее сябе падаць — нават па дарозе на работу ды з работы. Што ўжо казаць пра танцы?!

У адну з субот у Доме культуры здымалі кіначасопіс «Вечар адпачынку фабрычнай моладзі». Я — з той самай моладзі, да таго ж — актывістка! Мне запрашальнік далі ў камітэце камсамола! І вось гэта — мой першы сапраўдны баль!

Яшчэ здалёк я чую музыку, бачу бляск агнёў, паркет... Я лячу туды як на крылах!..

Але ж людзей вакол сябе таксама бачу — хлопцаў, дзяўчат, міліцыянера...

Сяброўцы потым расказваю, які ж маладзенькі тады дзяжурыў, які прыгожанькі, акуратненькі, а ўжо вочы...

— Усё, хопіць, — перапыняе Анюта. — Я за яго замуж пайду.

— Як гэта пойдзеш? Што — ні разу не ўбачыўшы?

— А навошта мне на яго глядзець? Табе ж спадабаўся?

На гэтым жартачкі «ў тэму» скончыліся — як мне здавалася, назаўжды. Аж не: Анюта, як выглядала, адступаць ад свайго не збіралася. У наступную суботу яна ўжо і пабачыла таго прыгажунчыка, і даведалася, як завуць, і нават закадрыла, бо праз тыдзень на танцах Толя ўжо круціўся ля яе ў новай белай кашулі і цывільным адпрасаваным касцюме... (Вось толькі сяброўка на яго — нуль увагі! Чаму?)

...А між тым — канец снежня, хутка Новы год. Аня з'ездзіла ў Маскву па абноўкі. Пахвалілася мне, што па дарозе — і туды, і назад — пазнаёмілася з хлопцамі, запрасіла ў госці.

Факт, што вечарам 31-га мы з ёй (суседкі па пакоі раз'ехаліся па дамах) ужо сустракаем гасцей. Як на падбор усе — відныя, разадзетыя, з шампанскім, з цукеркамі.

Аня прывячае іх, запрашае распрануцца — і аднаго, і другога, і трэцяга... Калі сёмы(?!) зайшоў, мне аж вусцішна стала! Шапчу ёй: «Анька, ты звар'яцела! Яны ж такія культурныя, пакуль цвярозыя, а потым што, калі нечага вып'юць?» Яна ў адказ мне: «А ты не бойся! Моладзі ў будынку шмат. Кожны сабе пару знойдзе».

І праўда, павяла яна хлопцаў на ёлку, на танцы, пазнаёміла з дзяўчатамі...

Гляджу, нехта з гасцей адразу ж сваё паліто ў нас забраў, нехта пазней. Гасцінцы Аня ўслед паразносіла. А да нас прывяла... Толю.

Толькі тут да мяне дайшло, што гэтыя госці былі часткай яе каварнага плана: дзеўка тым самым хацела паказаць, што ў яе ад кавалераў адбою няма, — прымусіць Анатоля раўнаваць і... дзейнічаць.

Трэба сказаць, што гэта ёй удалося: пасля навагодніх свят яны сталі сустракацца ледзь не штодня, хлопец, бывала, заходзіў у наш пакой.

— Пашпарт узяў? — спытала неяк дзяўчына. (Давяла такі Толю да загса!)

...І вось мы там. Рэгістратар — пажылая сур'ёзная жанчына — пачынае сваю завучаную «прамову», а мы з Аняй, як успомнім, з чаго пачалося, не можам стрымацца ад смеху!..

Карацей, адправілі нас з загса — можна сказаць, нават выгналі.

Парагатаўшы хвілін з пятнаццаць на вуліцы, мы яшчэ раз зайшлі. Аня такі выйшла замуж за Толю.

...Дарэчы, пасля вяселля ён мне па-сяброўску сказаў, што я зусім не ўмею хлопцаў кадрыць, таму замуж наўрад ці выйду.

Я тады адмахнулася: маўляў, каму ў голаў зойдзе, той за печчу знойдзе! І — што вы думаеце — праз чатыры гады мяне праўда знайшлі... Але, не за печчу, а ў бібліятэцы, за стэлажом.

Любоў Чыгрынава,

г. Мінск.

«ЭСТАФЕТА»

Аднойчы падчас службы ў войску я назіраў дзве досыць цікавыя сцэны (у арміі, дарэчы, шмат цікавага — толькі назірай. А я гэта любіў. Нездарма ж потым мой начальнік называў мяне назіральнікам, праўда, кітайскім).

Дык вось неяк пад вечар наш полк разгружаўся на чыгуначнай станцыі пад Барысавам. Шум... Рух... Прыцемак... І ў ім — дзве постаці: адзін з нашых камандзіраў, падпалкоўнік, навыцяжку стаіць перад нейкім заезджым палкоўнікам, і той — злы, што гад, — за нешта яго распякае. Усіх слоў было не разабраць, выразна чулася хіба кароткае: «Што ты дрыжыш?! Не дрыжы!»

Не дык не... Ды і казалі гэта не мне. Таму я хуценька пайшоў прэч. І, магчыма, забыўся б, аднак гісторыя мела працяг. Прыкладна праз месяц і ўжо «дома» (на тэрыторыі сваёй часці) я заўважыў таго самага падпалкоўніка. Перад ім навыцяжку стаяў прапаршчык. І я, праходзячы міма, ледзь стрымаўся ад смеху, бо пачуў: «Што ты дрыжыш?! Не дрыжы!»

...Шчыра кажучы, аж дрыжэў тады я — ад жадання ўбачыць, як перад гэтым прапаршчыкам па стойцы «смірна» будзе стаяць салдат!

Шкада, што не ўбачыў.

Яўген Шастакоў.

г. Гомель.

СЮРПРЫЗ ДЛЯ КЛАСНАГА

Не вам казаць: настаўнікі ў школе не толькі выкладаюць дзецям тыя ці іншыя прадметы, але і выхоўваюць іх, працуюць у добрай згодзе з бацькамі.

Дык вось. Набліжалася адно з самых любімых свят — 8 Сакавіка. Дзеці загадзя куплялі паштоўкі, кнігі (найлепшы падарунак!), нешта малявалі, пісалі вершы-прысвячэнні — думалі, чым парадаваць матуль, бабуль, любімых настаўніц...

Хоць у той год, пра які пішу, задача ў вучняў трохі спрашчалася. Школа шмат і задарма, што называецца, працавала ўвосень на ўборцы бульбы і буракоў — дапамагала мясцоваму калгасу. А таму ўрэшце яго праўленне вырашыла неяк аддзячыць: на сэканомленыя сродкі купіць падарункі, уручыць іх кожнаму класнаму кіраўніку (дакладней, вядома ж, кіраўніцы, бо мужчын сярод іх як кот наплакаў)...

Вестка пра гэта дайшла, вядома ж, і да дзяцей. Ім так і сказалі: не хвалюйцеся, маўляў, падарункі будуць... Усім.

— Усім, ды не ўсім, — напярэдадні свята аб'явіў аднакласнікам Віця Сінцоў. — У клубе стаяць тыя скрынкі з падарункамі... У прыгожых абгорт-ках, з надпісамі, каму... Я ўсе пакункі перабраў — нашаму класнаму падарунка няма.

— Як гэта? Не можа быць! — за ўсіх спалохалася старасta.

— А вось так!

— Чаму? Гэта няправільна! Несправядліва! — дружна прызналі пяцікласнікі і, каб выправіць памылку, сталі тут жа страсаць капейкі, якія бацькі давалі ім на абеды.

...У краму па падарунак адправілі самага смелага — Віцю. Што канкрэтна трэба купіць, не сказалі — на што хопіць грошай. А таму ў краме, пачакаўшы, пакуль усе разыдуцца, хлопчык проста падаў прадавачцы грошы і ціхенька сказаў:

— Мне сюрпрыз.

Жанчына, што стаяла за прылаўкам, не пыталася, для каго: ну вядома ж, для маці — прыгожай, вельмі паважанай жанчыны і... яе сяброўкі!

Не пыталася і які: перад святам у краму да яе завезлі страшны дэфіцыт (па тым часе — мару ўсіх вясковых, а мо і гарадскіх жанчын): чорныя капронавыя панчошкі са швом і шчыльнай пяткай (пра калготы ніхто тады і не чуў).

Прадавачка прыгожа іх запакавала і падала Віцю.

Радасць яго (ды і аднакласнікаў...) была бязмежнай: ёсць падарунак для класнага! (Прыгожы банцік на пакунку ніхто і не падумаў развязваць!..)

І вось — свята. Празвінеў званок з урока матэматыкі, якую выкладаў той любімы класны. Стараста скамандавала ўсім устаць, а сама рушыла да дошкі:

— Дарагі Павел Іванавіч! — з хваляваннем звярнулася яна да настаўніка. — Дазвольце нам у гэты прыгожы вясновы дзень ад імя ўсяго класа ўручыць вам сюрпрыз.

Павел Іванавіч нічога падобнага не чакаў: разгубіўся, не зразумеў... Але ж пад шквал апладысментаў... падарунак узяў і падзякаваў.

...Потым, пасля свята, настаўнікі ва ўсіх сваіх класах правялі далікатныя размовы з вучнямі аб тым, як трэба віншаваць сваіх блізкіх, каму, што, калі і як можна падарыць.

А здаровы жаночы рогат у настаўніцкай, калі Павел Іванавіч разгарнуў пакунак з банцікам, застаўся, як кажуць, за кадрам.

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

P. S. Дарэчы, было гэта ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Тады дзяўчынкі не рабілі падарункаў хлопчыкам на 23 лютага, бо дзень лічыўся святам армейцаў і маракоў, а не ўвогуле мужчын...

І на 8 Сакавіка хлопчыкі не віншавалі дзяўчынак, бо свята жаночае, а якія ж яны жанчыны?

Гэта цяпер усе віншуюць усіх!

Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж усім, хто прымаў і будзе прымаць віншаванні, шчырае:

8. Об утверждении Положения о порядке осуществления постоянного внутреннего контроля финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Белгорхимпром».

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, приемная генерального директора) в рабочие дни в период с 16 по 30 марта 2020 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, – в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж).** При себе иметь следующие документы: **акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП600024712

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Царква. Галёш. Удар. Час. Іскра. Робат. Доза. Брава. Анафара. Бінт. Пас. Асалода. Вілка. Рак. Адзнака. **Па вертыкалі:** Кеглі. Жулік. Цешча. Код. Акр. Усход. Абраз. Божа. Тата. Абраза. Вырадак. Фініш. Атака. Апора. Асака. Сад.

Склаў
Юрый ФАЛІНСКІ,
г. Мінск.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.02	18.43	10.41
Віцебск —	7.54	18.31	10.34
Магілёў —	7.52	18.33	10.41
Гомель —	7.46	18.32	10.46
Гродна —	8.16	18.59	10.43
Брэст —	8.15	19.02	10.47

Месяц

Маладзік 23 лютага.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Сафіі, Анісіма, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*
К. *Антаніны, Людмілы, Антона, Макара, Рамана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Яны кажуць, што я — вар'ят, але гэта не так!

— Хто кажа?

— Галасы ў маёй галаве.

— Прывядзіце прыклад «лішняга» чалавека на гулянцы.

— Непітушчы, які не ўмее вадзіць машыну!

Калі тэхналогіі дойдуць да таго, што пісаць у месенджары і сацсетках мы будзем не рукамі, а сілай думкі, галоўнае — не забыцца зрабіць так, каб кнопку «адправіць» трэба было ўсё ж абавязкова націскаць пальцам. А то ўсе ўшчэнт перасварацца.

— На самай справе жыць у грамадзянскім шлюбе — гэта зручна.

— І нядорага.

Даты Падзеі Людзі

28 ЛЮТАГА

У краіне

1706 год — у Мінску, падчас Паўночнай вайны, у доме Сапег на вуліцы Юр'яўскай (у раёне цяперашняй Кастрычніцкай плошчы) пасяліўся Пётр I і прабыў тут да 13 сакавіка. Дом разбураны падчас бамбардзіровак Мінска нямецкай авіяцыяй у чэрвені 1941-га.

1710 год — мінскім кашталянам прызначаны Сымон Друцкі-Любецкі, прадстаўнік старажытнага беларускага роду нашчадкаў удзельных полацкіх князёў. Аднак тытул ён прыняць не паспеў з-за смерці.

1943 год — адбыўся бой партызан атрада «Камсамол» першай Мінскай партызанскай брыгады супраць гарнізона нямецка-фашысцкіх захопнікаў у вёсцы Ляды Смалявіцкага раёна, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Лядскі бой. Партызаны захапілі ў палон начальніка варты Лядскага гарнізона, які пагадзіўся правесці партызан за паласу аховы. Група разведчыкаў атрада зняла вартавых і акружыла каравульнае памяшканне. Другая група прабралася ў казарму гітлераўцаў і захапіла зброю і боепрыпасы.

1946 год — нарадзіўся Віктар Паўлавіч Іўлічаў, беларускі архітэктар. Сярод работ — міжнародны маладзёжны цэнтр «Юнацтва» на Заслаўскім вадасховішчы, станцыя метро «Інстытут культуры», будынак Генеральнага консульства Польшчы, генпланы Магілёва, Віцебска, Гродна, Гомеля, Брэста і іншыя праекты. Удзельнічаў у рэканструкцыі плошчы Перамогі ў Мінску, будынка абласнога драматычнага тэатра ў Гомелі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2003).

У свеце

2000 год — падпісана пагадненне паміж урадамі Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Кіпр аб супрацоўніцтве ў галіне друку і інфармацыі.

1720 год — у Расіі быў выдадзены так званы Генеральны рэгламент, складзены пры ўдзеле Пятра I, — установчы статут дзяржаўнай грамадзянскай службы ў XVIII — пачатку XIX стагоддзя.

1920 год — нарадзіўся Аляксей Макаравіч Смірноў, расійскі акцёр, заслужаны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Паласаты рэйс», «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка», «У бой ідуць адны старыя» і іншых.

1930 год — нарадзіўся Леон Купер, амерыканскі фізік-тэарэтык, адзін з аўтараў мікраскапічнай тэорыі звышправаднасці, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1972).

1940 год — савецкі лётчык-выпрабавальнік Уладзімір Фёдараў здзейсніў першы ў свеце палёт на ракетапланеры з вадкасным рэактыўным рухавіком.

1960 год — нарадзілася Людміла Уладзіміраўна Цітова, расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расійскай Федэрацыі. Здымалася ў фільмах «Энергічныя людзі», «Два лёсы», «Дом на набярэжнай», «Лес» і іншых.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 389. Нумар падпісаны ў 19.30 27 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

28 лютага 2020 г. № 8 (544)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЗРАБІ САМ!

«Хіт-парад» ініцыятыў

Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

Рух тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў Гомелі становіцца ўсё больш папулярным: жыхары шматпавярховікаў, якія яшчэ ўчора, здаецца, не ведалі імя суседа па пляцоўцы, цяпер самаарганізоўваюцца, генеруюць ідэі і вырашаюць канкрэтныя задачы па паляпшэнні ўмоў суіснавання ў агульным дварэ

Сёння актыўныя камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ёсць у кожным раёне Гомеля. Усяго іх амаль тры дзясяткі.

Самыя яскравыя прыклады дваровых ініцыятыў — стварэнне сваімі сіламі новых дзіцячых комплексаў і пляцовак для заняткаў спортам. Па выніках года намаганні гамяльчан ацэньваюцца гарсаветам дэпутатаў. Сярод удзельнікаў адмысловага хітпарада ідэй па добраўпарадкаванні вызначаюць лідараў. На разліковыя рахункі камітэтаў, якія прызнаюцца лепшымі, залічваюцца неблагія грошы.

З сёлетнімі намінантамі конкурсу ўдалося пазнаёміцца падчас спецыяльнага агляду дваравых тэрыторый разам з дэпутатамі Гомельскага гарсавета. Ініцыятарам «рэвізіі» стаў яго **старшыня Мікалай КАВАЛЕВІЧ.**

стар. 4

АКТУАЛЬНА

КАБ БЫЎ ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

Як мясцовыя Саветы і органы грамадскага самакіравання падтрымліваюць чысціню і прыгажосць тэрыторый

Нам, беларусам, бясконца дарагое, хвалюючае, усё, што ёсць на роднай зямлі. Бо тут — наша душа, а дзе душа, там і сапраўдная радзіма чалавека. А любоў да Бацькаўшчыны, да роднай прыроды, парадак на зямлі, клопаты пра чысціню і прыгажосць нашых паселішчаў — не проста паняцці, а пастаянная карпатлівая работа, добра арганізаваная, дзе руплівасць і культура людзей арганічна пераплятаюцца.
Пра тое, як падтрымліваецца парадак, наколькі ініцыятыўная мясцовая ўлада, што прыносяць агульныя пошукі і намаганні давялося пагаварыць са старшынёй Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, членам Савета Рэспублікі Юрыем НАРКЕВІЧАМ.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Прыдзвіння стала больш

Плошча Віцебшчыны павялічыцца на 1160 гектараў, пераважна за кошт лясоў. стар. 3

Вяртанне да вытокаў

Як у Магілёўскім раёне жыхары наводзяць прыгажосць у сваіх населеных пунктах. стар. 4

Руйнаваць ці пакінуць?

Чаму лесапільня падзяліла жыхароў вёскі Струпень, што на Міншчыне, на два лагеры. стар. 13

Інвестыцыі ў будучыню

Як у аграгарадку Васход Магілёўскага раёна рэканструявалі дзіцячы сад-яслі. стар. 16

Карані травы

Дзякуючы гэтаму праекту ўстановы Брэстчыны атрымалі медыцынскае абсталяванне і спартыўныя трэнажоры. стар. 16

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Сталіца: вынікі і задачы

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец узяў удзел у пасяджэнні адміністрацыі Заводскага раёна Мінска.

Былі разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна за 2019 год і задачы на 2020-ы, ход выканання структурнымі падраздзяленнямі адміністрацыі Заводскага раёна Комплексу мер па прыцягненні замежнай бязвыплатнай дапамогі ў Рэспубліку Беларусь на перыяд да 2020 года і іншыя пытанні.

Пасля заканчэння пасяджэння парламентарый адказаў на пытанні, якія датычыліся ўдасканалення палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове працы» ў частцы прафілактыкі вытворчага траўматызму і адказнасці наймальнікаў за незабеспячэнне бяспечных умоў працы.

У рамках абмеркавання дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб правядзенні парламентарыем у сакавіку выязнога прыёму грамадзян у адміністрацыі Заводскага раёна сталіцы.

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у пасяджэнні адміністрацыі Савецкага раёна Мінска.

Былі абмеркаваны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна і выкананне бюджэтнага каштарыса адміністрацыі за мінулы год, пастаўлены задачы на 2020 год, а таксама разгледжаны іншыя пытанні.

Выступаючы па пытанні «Аб выніках выканання бюджэтнага каштарыса адміністрацыі Савецкага раёна Мінска за 2019 год і стане ўнутрыгаспадарчага кантролю», парламентарый засяродзіла ўвагу прысутных на неабходнасці безумоўнага выканання заканадаўства ў частцы ўнясення змяненняў у бюджэтны каштарыс раёна. «Пераразмеркаванне гадавых планавых асігнаванняў па артыкулах расходаў неабходна рабіць у выключных выпадках, старанна аналізуючы прапановы арганізацый», — рэзюмавала Таццяна Рунец.

Акрамя таго, сенатар звярнула ўвагу кіраўніцтва раёна на важнасць правядзення комплекснай работы па зніжэнні сумы дэбіторскай запазычанасці ў цэлым па раёне, а таксама памяншэнні колькасці стратных арганізацый.

Чым жыве рэгіён?

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы ўзяў удзел у пасяджэнні сесіі Кармянскага раённага Савета дэпутатаў.

Акрамя таго, у рамках адзінага дня інфармавання парламентарый наведаў філіял ААТ «Гомельлён» «Кармянскі льнозавод» Гомельскай вобласці.

Сяброўства на ўзроўні парламентаў

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў узяў удзел у пасяджэнні рабочай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з Парламентам Фінляндскай Рэспублікі.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны пытанні развіцця беларуска-фінляндскіх адносін, перададзена запрашэнне членам рабочай групы Нацыянальнага сходу ад кіраўніка фінляндскай групы дружбы з Беларуссю наведаць Хельсінкі з візітам.

ВІЗІТЫ

МАСКВА—МІНСК—БРЭСТ

Падрыхтоўка да Форуму рэгіёнаў, акцыя «У гонар агульнай Перамогі!», сустрэча з ветэранамі...

На наступным тыдні запланаваны двухдзённы візіт у нашу краіну парламенцкай дэлегацыі Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Фэдэрацыі на чале з яго старшынёй Валянцінай Мацвіенка. Пра гэта паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.

Праграма насычана падзеямі: у першы дзень візіта — 5 сакавіка — сустрэчы на высокім узроўні: са старшынямі дзвюх палат беларускага парламента — Наталляй Качанавай і Уладзімірам Андрэйчанкам, удзел у пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які сёлета плануюць правесці ў беларускай сталіцы і Мінскай вобласці. Дарэчы, будучы Форум будзе прысвечаны гістарычнай спадчыне Вялікай Перамогі як аснове развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў нашых краін.

У гэтым кантэксце лагічна выглядае запланаваны ўдзел старшыні Савета Федэрацыі ў перадачы капсулы з зямлёй у рамках Міжнароднай акцыі памяці «У гонар агульнай Перамогі!», што адбудзецца ў храме-помніку Усіх Святых. Акрамя таго, расійскія парламентарыі атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з грунтоўнымі экспазіцыямі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На другі дзень візіту — 6 сакавіка — парламенцкая дэлегацыя Савета Федэрацыі адправіцца ў Брэст, дзе ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўскладання вянка да Вечнага вогнішча. Пасля экскурсіі па мемарыяльным комплексе запланавана сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Вольга АНУФРЫЕВА.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

Кадры ў кадры

Выпускнікі рабочых прафесій заўсёды запатрабаваныя на рынку працы

Пра гэта старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ заявіў падчас сустрэчы з калектывам і навучэнцамі гродзенскага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну ў рамках адзінага дня інфармавання.

Азнаёміўшыся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы адукацыі, дзе ў 2011 годзе быў адкрыты рэсурсны цэнтр з сучасным абсталяваннем і найноўшымі тэхналогіямі навучання, сенатар падкрэсліў асаблівую важнасць сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Паводле яго слоў, яна надзяляе выпускнікоў рабочымі прафесіямі, якія заўсёды запатрабаваныя на рынку працы.

— Самы вялікі плюс навучальнай установы ў тым, што праграмы тут практыка-арыентаваныя. Навучэнцы займаюцца ў рэсурсным цэнтры, стажыруюцца на прадпрыемствах. Падрыхтаваныя такім чынам спецыялісты, несумненна, запатрабаваныя, іх прафесіі прэстыжныя. Каледж — гэта сур'ёзная стартавая пляцоўка, — адзначыў Віктар Лісковіч.

Нядзіўна, што выкладчыкі і навучэнцы гродзенскага каледжа — актыўныя ўдзельнікі конкурсу прафмайстэрства WorldSkills. Спробы гродзенцаў прадэманстраваць свае навыкі ў розных кампетэнцыях нярэдка прыносяць ім прызавыя месцы. Літаральна за некалькі гадоў беларуская зборная, у склад якой уваходзяць і гродзенцы, значна прасунулася ў сусветным рэйтынгу камандаў.

Поспехам моладзі спрыяюць пастаяннае павышэнне кваліфікацыі педкалектыву, закупка абсталявання і адкрыццё рэсурсных цэнтраў. Немалаважна, што ў навучанні ў каледжы выкарыстоўваюцца тэхналогіі, якія ўжываюцца на вытворчасці і з якімі выпускнікам трэба будзе мець справу. Гэта, зноў жа, істотны аргумент на карысць рабочых спецыяльнасцяў для эканомікі краіны.

Па словах Віктара Лісковіча, дзяржава зацікаўлена ў кадрах, забяспечваючы, у адрозненне ад многіх іншых краін, выпускнікоў гарантаваным першым рабочым месцам і іншымі прэферэнцыямі, якія адпавядаюць статусу «малады спецыяліст».

Што да іншых пазіцый сацыяльна арыентаванай палітыкі дзяржавы, то безумоўную падтрымку знаходзяць шматдзетныя бацькі. Старшыня профільнай камісіі нагадаў, што ў Беларусі ўсяляк стымулюецца і заахвочваецца нараджэнне другога, трэцяга і наступных дзяцей. Так, з 1 лютага падраслі ўсе выплаты і дапамогі на малых. Акрамя таго, створаны аптымальныя ўмовы для нараджэння і выхавання дзяцей: на высокім узроўні знаходзяцца медыцынскія паслугі, забяспечваюцца сацыяльныя гарантыі, падтрымліваецца на належным узроўні экалагічны стан.

Гэта спрыяе не толькі росту нараджальнасці, але і інтарэсу замежных грамадзян да Беларусі. У Гродзеншчыны, на думку Віктара Лісковіча, вялікі турыстычны патэнцыял. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы дзеянню бязвізавага рэжыму.

— Бязвіз даў магутны імпульс для развіцця турызму ў рэгіёне. Край над Нёманам мае багатую культурна-гістарычную спадчыну. А якія ў нас брэндавыя мерапрыемствы! У якасці прыкладу на розум прыходзіць Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. У 2018 годзе больш за 270 000 гасцей наведала гэтае свята. Трэці дзень прайшоў на Аўгустоўскім канале, і на воднай жамчужыне Гродзеншчыны пабывала больш за 25 000 людзей.

Напрыканцы парламентарый нагадаў, што сёлета адбудуцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ён звярнуў увагу, што ў моладзі не павінна ўзнікаць пытання: ісці ці не на выбары? Гэта абавязак кожнага грамадзяніна — паўдзельнічаць у лёсе сваёй дзяржавы. Дэмакратыя — вялікая выгада, якой мы можам карыстацца, фарміруючы палітычную карціну будучага дня.

Па матэрыялах «Гродзенскай праўды».

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

Прыбытак у бюджэце і сяброўстве

Гандаль паміж Беларуссю і ЗША летась павялічыўся на 20 працэнтаў. Пра гэта паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Віктар НІКАЛАЙКІН падчас сустрэчы з супрацоўнікамі міністэрства гандлю ЗША.

«За 2019 год знешнегандлёвы абарот таварамі паміж нашымі краінамі склаў больш за 850 мільёнаў долараў. Гэта рост на 20 працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам. А экспарт паслуг, якія паставілі нашы кампаніі ў Злучаныя Штаты Амерыкі, ужо наблізіўся да мільярда долараў. Штогод колькасць арганізацый з амерыканскім капіталам павялічваецца. Гэта радуе і сведчыць аб тым, што мы знаходзімся апошнія гады на правільным шляху», — адзначыў дэпутат.

На яго думку, такім дасягненням спрыяюць у тым ліку візіты афіцыйных асоб, якія летась актывізаваліся. Віктар Нікалайкін выказаў упэўненасць, што і цяперашні візіт паспрыяе далейшаму развіццю адносін не толькі ў гандлі, але і ў іншых сферах.

Старшыня камісіі нагадаў, што хоць Беларусь і адносіцца афіцыйна да Усходняй Еўропы, геаграфічна знаходзіцца ў цэнтральнай частцы, а значыць, і ў вельмі выгадных гандлёвых умовах.

«Сёння для нас вельмі важны досвед іншых краін, у тым ліку такой вялікай дзяржавы, як Злучаныя Штаты Амерыкі. І мы з задавальненнем гатовыя яго выкарыстоўваць, у тым ліку на заканадаўчым узроўні», — звярнуўся да супрацоўнікаў амерыканскага міністэрства дэпутат.

У сваю чаргу, **другі сакратар пасольства ЗША ў Беларусі Моніка СЭНДАР** падкрэсліла, што мэта візіту — менавіта вывучыць магчымасці ўдасканалення заканадаўства, садзейнічаць абменам і адшукаць новыя магчымасці для супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Штатамі.

Варвара МАРОЗАВА.

КАБ БЫЎ ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

Калі ўзяцца талакой

— Каштоўны вопыт, важкія набыткі ў гэтай рабоце маюць многія сельскія Саветы вобласці, — пачаў свой аповед Юрый Іосіфавіч. — Напрыклад, Клейнікаўскі сельсавет Брэсцкага раёна прымае канкрэтныя меры для камфортнага пражывання насельніцтва на сваёй тэрыторыі. У тым ліку і праз развіццё інжынернай інфраструктуры ў населеных пунктах. Сельсавет змог прыцягнуць да рашэння гэтай праблемы саміх грамадзян. Створаны і дзейнічае спажывецкі кааператыў «Інжынерныя праекты—2017» аграгарадка Клейнікі, які распрацаваў праектна-каштарысную дакументацыю для падводу цэнтральнай каналізацыі да сямі вуліц. Работы праведзены ў другім паўгоддзі 2019 года з долевым фінансаваннем: з боку раённага бюджэту 70 % і жыхароў — 30 %.

Варта адзначыць яшчэ адзін надзвычай важны момант. Пры вырашэнні пытанняў павышэння ўзроўню жыццезабеспячэння сельскі Савет заўсёды мае дапамогу і падтрымку ным маладыя сем'і, сярод іх ёсць шматдзетныя. Тут не было дзіцячай пляцоўкі, і да бліжэйшай мамы з каляскамі дабіраліся пешшу кіламетр, а то і больш. Алена Мельнік найперш вынесла гэтае пытанне на сельскі сход. Стварылі ініцыятыўную групу, сабралі грошы, за якія набылі неабходныя будаўнічыя матэрыялы. Сельвыканкам купіў абсталяванне. А на расчыстку пляцоўкі, добраўпарадкаванне тэрыторыі выйшла большасць жыхароў квартала. І цяпер гэтай пляцоўкай карыстаюцца ўсе.

Раней па вуліцы Пагранічнай у Клейніках вясной і восенню было цяжка і прайсці, і праехаць. Таксама на сходзе жыхары вырашылі: трэба ўжо самім дзейнічаць, а не толькі пісаць скаргі. Сабралі грошы, купілі матэрыял для падсыпкі. Потым за работу ўзяліся дарожнікі — правялі падсыпку і грэйдзіраванне вуліцы, па якой цяпер прыемна хадзіць у любое надвор'е. І што цікава: цяпер жыхары Пагранічнай вуліцы ставяцца да яе надзвычай беражліва, самі пільна сочаць, каб тут не хадзілі велікагрузы. Калі ж хто-небудзь парушае правілы — адразу інфармуюць кампетэнтныя службы.

органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Актыўна працуе дэпутацкі корпус з 11 чалавек і 6 старастаў.

Менавіта праз іх выканкам трымае пастаянную сувязь і інфармуе людзей па ўсіх актуальных пытаннях. Такое цеснае ўзаемадзеянне дазваляе аператыўна вырашаць многія праблемы, якія ўзнікаюць на тэрыторыі адміністрацыйнай адзінкі.

На тэрыторыі сельсавета створаны чатыры дамавыя камітэты і адзін жыллёва-будаўнічы кааператыў. Іх галоўны абавязак — навядзенне парадку вакол шматкватэрных дамоў. Штогод жыхары разбіваюць клумбы, высаджваюць кветкі і кусты, ствараюць малыя архітэктурныя формы. Усё робіцца з густам, прыгожа.

Па ініцыятыве сельвыканкама штогод праводзіцца конкурс на лепшую прыдамавую тэрыторыю. Лепшыя гаспадары ўзнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі ў Дзень вёскі. Тут вельмі ініцыятыўны, энергічны кіраўнік сельвыканкама Алена Мельнік. Яна смела бярэцца за любыя праблемы, якія турбуюць жыхароў, і вырашае іх. Прыкладаў можна прыводзіць шмат. У квартале новай забудовы аграгарадка жывуць у асноў-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У адной звязцы

У Ленінскім сельсавеце Жабінкаўскага раёна многа зрабілі для азелянення тэрыторыі. Восенню 2018 года пасаджана шмат дрэў уздоўж трасы М-1, а таксама каля помніка загінулым землякам, у скверы... Дубы, бярозы, яліны прыйшліся тут вельмі дарэчы. Сельсавет усяляк стараецца прыцягваць інвестыцыі, мае падтрымку Брэсцкага абласнога цэнтра садзейнічання малому бізнесу, удзельнічае ў розных міжнародных праектах. Нездарма ў канцы 2018 года абласны Савет дэпутатаў правёў на базе Ленінскага сельвыканкама вучэбны семінар са старшынямі сельсаветаў.

Мэтанакіраваная работа па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, захаванні прыродных комплексаў, павышэнні турыстычнай накіраванасці тэрыторый — важны накірунак дзейнасці Крывашынскага сельсавета Ляхавіцкага раёна, яго дэпутатаў, старастаў вёсак. Можна адзначыць, што тут умеюць выхоўваць любоў да роднага краю ў маладога пакалення. У 2018 годзе Крывошынская сярэдняя школа заняла першае месца ў раённым аглядзе-конкурсе па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый устаноў адукацыі, мае аднаку ў абласным этапе рэспубліканскага юніёрскага ляснога конкурсу «Квітней, мой лес!».

У склад Мокраўскага сельсавета Пружанскага раёна ўваходзіць 24 населеныя пункты. Падтрымліваць парадак у іх без дапамогі сельгаспрадпрыемства было б вельмі складана. Старшыня сельвыканкама Вольга Грышкевіч адзначае, што мясцовая ўлада і ААТ «Жураўлінае» працуюць у адной звязцы. Як вынік, у 2018 годзе вёска Мокрае стала пераможцам у абласным аглядзе-конкурсе па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, а ў 2019 годзе ў такім жа аглядзе-конкурсе ўвесь Мокраўскі сельсавет заняў першае месца па раёне і трэцяе — па вобласці. Атрыманыя грошы, вядома, патрацілі на добраўпарадкаванне.

Вясковыя старасты і актывісты

Пагаварылі мы і пра вясковых старастаў, якія, паводле вызначэння старшыні аблсавета, надзейная апора мясцовай улады. На сесіях раённых Саветаў прыняты палажэнні аб старастах і аб аглядах-конкурсах іх работы. Многімі старастамі сёння ганарацца ў раёнах.

Напрыклад, Антаніна Казачэнка, староста вёскі Кустын Лышчыцкага сельсавета Брэсцкага раёна выбіраецца на гэтую пасаду бесперапынна ўжо сем з паловай гадоў. Староста клапоціцца пра людзей, якія маюць сацыяльныя праблемы, пастаянна наведвае адзінокіх інвалідаў і тых, хто адзінока пражывае, як можа, ім дапамагае, даводзіць іх праблемы і патрэбы да мясцовай улады. Многія вяскоўцы сардэчна ўдзячныя Антаніне Іосіфаўне за ўвагу, дабрыню і клопат.

Шмат працуе Антаніна Казачэнка з вяскоўцамі і па навядзенні парадку на асабістых падворках. Ну а яе падворак — узорны ў вёсцы, тут сапраўдны рай з кветак і зеляніны.

Дзявяты год пайшоў, як старастам аграгарадка Лінава Лінаўскага сельсавета Пружанскага раёна быў абраны Дзмітрый Каляда. Ён ужо пенсіянер, але не можа сядзець без работы, і шмат робіць для роднай вёскі і яе грамады.

Варта адзначыць, што з 2009 года Брэсцкі абласны Савет дэпутатаў сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання праводзіць конкурс па вырашэнні пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва. І пры падвядзенні яго вынікаў да ўвагі бярэцца найперш парадак на падведамасных тэрыторыях. Гэты конкурс — яшчэ адна наша спроба засяродзіць увагу на парадку і прыгажосці тэрыторый. Не раз адзначаўся ў конкурсах камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея» з Баранавіч. Цяпер камітэт аб'ядноўвае ўжо каля пяці тысяч чалавек. Дзякуючы «Надзеі» змяніўся, папрыгажэў вонкавы выгляд пад'ездаў, дамоў, дваровых тэрыторый ды і ўсяго мікрараёна. Падобныя аб'яднанні працуюць у Пінску, Кобрыне, Брэсце.

Міхаіл ШЫМАНСКІ,
заслужаны работнік культуры БССР,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

ПРЫДЗВІННЯ СТАЛА БОЛЬШ

Плошча Віцебшчыны павялічыцца на 1160 гектараў. І на гэтай зямлі пераважна растуць лясы. Праект адпаведнага рашэння быў падтрыманы народнымі выбраннікамі на нядаўняй сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.

Яго **старшыня Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** растлумачыў калегам з дэпутацкага корпусу, што неабходныя змены «на карце» прадыктаваныя жыццём. І ў дадзеным выпадку вядомая фраза пра «пытанне ад зямлі» вельмі сімвалічнае. Напрыклад, як эфектыўна апрацаваць поле для пасяўной, калі яго частка на тэрыторыі адной вобласці, а другая — на суседняй? І як даглядаць за лесам, калі ёсць магчымасць рабіць там нарыхтоўкі, у тым ліку драўніны для перапрацоўкі, калі зямля «спрэчная»?

Ды і за дзесяцігоддзі мяняецца рэльеф: у сувязі з праведзенымі меліярацыйнымі работамі, будаўніцтвам, рэканструкцыяй дарог, уплывам прыродных фактараў на зямлю і гэтак далей. Ёсць і іншыя акалічнасці, якія трэба ўлічваць...

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігара ЛЕВЯНКОВА**, пяць гадоў таму пасля даручэння Савета Міністраў РБ завяршылі стварэнне зямельна-інфармацыйнай сістэмы (ЗІС). Такім чынам, у 2015 годзе ўпершыню ў нашай краіне з'явілася так званая лічбавая планава-картаграфічная аснова.

Вывучэнне вынікаў ЗІС паказала, што інфармацыя адрозніваецца ад зямельна-ўліковых даных. Гісторыя назапашвання неадкладнасцяў доўжыцца прыблізна пяцьдзясят гадоў, удакладніў згаданы спецыяліст.

Тэма, калі задумацца, датычыцца ўсіх, бо адрозненні на старых картах, паперах наконт зямлі, падпісаных дзясяткі гадоў таму, і таго, што існуе сёння ў рэальнасці, спрыяюць заблытанасці пры афармленні. Усе неабходныя матэрыялы перад сесіяй узгаднілі з раённымі выканаўчымі камітэтамі, кіраўніцтвам мясцовай улады прыгранічных з Віцебскай абласцей: Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай. Змены датычацца 30 % меж раёнаў.

Пры гэтым Віцебшчыну не толькі павялічылі, але і скарацілі. У прыватнасці, больш за астатніх страціў Лёзненскі раён — 1900 гектараў, а найбольшая прыбаўка ў Віцебскім раёне — каля 1360 га. У выніку «абмену» Прыдзвінне засталося ў плюсе.

Рашэнне «абласнога парламента» накіруюць ва ўрад для падрыхтоўкі адпаведнага нарматыўнага акта. Праект указа будзе прадстаўлены Прэзідэнту для разгляду.

Было падтрымана і параўнальна меншае, але таксама вельмі важнае зямельнае пытанне. Як растлумачыў Уладзімір Цярэнцьеў, жыхары пасёлка Віцьба, які знаходзіцца ў прыгарадзе абласнога цэнтра, накіравалі калектыўны зварот. Грамадзяне вельмі абгрунтавана прасілі перадаць у «тэрытарыяльную адказнасць» Бабініцкаму сельсавету частку зямлі Тулаўскага сельсавета Віцебскага раёна. Прычына — там знаходзяцца грамадзянскія могілкі. І тутэйшыя ўпэўненыя, што пасля перадачы іх «на баланс» суседняму органу прадстаўнічай улады будзе значна прасцей і аператыўней афармляць неабходныя для пахавання дакументы. Таксама яны выказалі надзею, што і навядзенне, падтрыманне парадку на тэрыторыі месца вечнага спакою сваякоў будзе на трохі іншым узроўні.

Дэпутаты зацвердзілі адпаведнае рашэнне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Хіт-парад» ініцыятыў

Дзве тысячы — на добрую справу

Першы пункт — вуліца Чачэрская: тыпавая забудова савецкага перыяду: дзевяціпавярховікі, побач школы і дзіцячыя садкі. Увогуле ў гэтых прасторных і светлых дварах калісьці былі нясхітрыя гульнявыя прыстасаванні, пясочніцы, турнікі. Але ўсё гэта ў мінулым. Напрыклад, у двары дома № 9 малым зусім не было дзе гуляць. Мясцовым актывістам прыйшла ў галаву думка стварыць казачны гарадок непасрэдна супраць пад'ездаў. Пачыналі, як усе: вывучалі попыт, аб'ядноўвалі жадаючых у суполку ў сацсетцы, прапаноўвалі суседзям скінуцца, хто колькі можа. Для жыхароў стала рэальна даць на добрую справу 10—50 рублёў. Сабралі каля дзвюх тысяч. Грашовую дапамогу аказалі таксама спонсары — вядомае гомельскае прадпрыемства. Работы па добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі і ўсталяванні гарадка выканалі работнікі КЖРЭУП «Цэнтральнае». Цяпер гульнявы комплекс — цэнтр прыцягнення малых нават з суседніх двароў.

А вось жыхары дома па Малайчука, 21 яшчэ ў самым пачатку шляху. Пакуль агульнымі намаганнямі зрабілі і ўсталявалі драўляную альтанку. Цяпер уся энергія накіравана на генерацыю новых ідэй. Двор пакідае ўражанне занядбанасці. Але трэба адзначыць, што на гэтай тэрыторыі наладзіць грамадскую дзейнасць даволі складана. Дамы старой забудовы, жыхары — пераважна пенсіянеры. Дзяцей вельмі мала. Бабулі — гэта асноўная мэтавая аўдыторыя. У іх свае запыты, таму ў камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання дэвіз: камфортна павінна быць усім — і маладым, і сталым. Вось чаму і пачалі з альтанкі. У перспектыве — новыя скамейкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На карысць двара

У Савецкім раёне самымі ініцыятыўнымі аказаліся жыхары вуліцы Гайдара, дзе ўздоўж двары плаўна пераходзяць адзін у другі і ўтвараюць адну вялікую прастору.

— Двор вельмі стары, мы самі бегалі тут яшчэ дзецьмі. Тады ён быў прыгожы, дагледжаны, але потым усё прыйшло ў заняпад, — расказвае **старшыня камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Гайдараўскі» Ганна БУЛАНОВІЧ.** — Цяпер у нас дзеці, і мы хочам вярнуць свайму двару былую прыгажосць.

Сілы аб'ядналі каля 60 мам, якія далучылі да дзейнасці сваіх мужчын. Дапамогу ініцыятыўным бацькам аказалі дэпутаты і работнікі РЭУ. За кароткі тэрмін разам зрабілі велізарны аб'ём работы.

— Усё дзякуючы таму, што мы не чакалі, калі за нас нешта зробяць іншыя, вольны час выкарыстоўваем на карысць рэалізацыі ідэй, — стымулюе іншых сваім прыкладам Ганна Булановіч.

Дарэчы, цэнтральную фігуру двара — дзіцячы верталёт — дапамог аднавіць дэпутат Міхаіл Пачынак. Многія элементы для адпачынку мясцовыя мужчыны змайстравалі сваімі рукамі. У ход пайшлі і драўляныя паддоны, і шпулькі ад кабеля. Усё было клапатліва ачышчана ад бруду і пафарбавана.

— Так дзеці атрымалі цікавы лабірынт, за які нікому не прыйшлося плаціць, — працягвае экскурсію старшыня камітэта «Гайдараўскі». — Вядома, купілі і сучаснае абсталяванне для дзяцей. Але ўлічваючы, што ідэю падтрымалі вельмі шмат мясцовых бацькоў, атрымалася ўсё даволі танна.

Што чакае пераможцаў?

На вуліцы Беліцкай у мікрараёне Хутар, дзе ў актыўнай жыллёвай забудоўцы шматпавярховікі растуць, як грыбы пасля дажджу, жыхары новабудоўляў таксама аператыўна ўзяліся за добраўпарадкаванне. Яны аб'ядналіся і стварылі камітэт «Крышталь», які курыруе грамадскую дзейнасць адразу ў некалькіх дварах.

Ёсць свае асаблівасці: між шматпавярховак суцэльны пясок, забудоўшчыкі выконваюць мінімум па добраўпарадкаванні, што не можа задавальняць жыхароў. Спачатку актывісты спланавалі некалькі зручных зон для адпачынку дзяцей і падлеткаў. Ажыццявілі задуманае і ўзяліся за азеляненне тэрыторыі. Папярэдне вывучылі схему падземных камунікацый, потым высадзілі ў дварах дрэвы, кожнае з якіх замацавалі за пэўнай кватэрай. Кажуць, усе з задавальненнем прынялі на сябе абавязак рэгулярна іх паліваць. Усе саджанцы прыжыліся.

Але сапраўдны фурор у раёне і горадзе зрабіла самастойна зробленая камітэтам «Крышталь» шматфункцыянальная спартыўная зона. Урокі здароўя тут штотыднёвыя: пляцоўкі для гульні ў пляжны валейбол, баскетбол, пабудавалі тэнісны корт, зрабілі паўнавартасную пляцоўку з агароджай для гульні ў футбол.

Мясцовыя бацькі ў выхадныя выходзілі ў двор цэлымі будбрыгадамі: варылі метал, цяслярылі, малярнічалі. Грошы ж патрацілі на куплю мячоў і спартінвентару. Цяпер падумваюць набыць траўмабяспечныя вулічныя трэнажоры.

Пераможцаў конкурсу на званне лепшага камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання вызначаць на сесіі Гомельскага гарсавета дэпутатаў і агучаць на пачатку сакавіка, — паведаміла **галоўны спецыяліст гарсавета Аксана ПЕТРАЧЭНКА.** — Будуць вызначаны ўладальнікі першага, другога і трэцяга месцаў. Камітэты-пераможцы атрымаюць грашовы прыз у памеры — 100, 50 і 25 базавых велічынь адпаведна. Згодна з пастанаўленнем аб правядзенні конкурсу, за грошы можна набыць неабходныя матэрыялы, інвентар ці прыстасаванні, і толькі зусім невялікая сума разлічана на заахвочванне актывістаў камітэта.

Таксама ўладальнік 1-га месца да канца года павінен дасылаць у камісію фотасправаздачы аб сваёй рабоце, праводзіць мерапрыемствы і актыўна развівацца. Гэта галоўная ўмова, каб прадставіць Гомель на абласным конкурсе ў 2021 годзе.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

МАТАЙ НА ВУС

ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ

Як у Магілёўскім раёне жыхары наводзяць прыгажосць у сваіх населеных пунктах

Гаворка ідзе пра Семукацкі сельсавет, у складзе якога 29 населеных пунктаў з агульнай колькасцю 949 жыхароў. Паміж вёскамі няма рэгулярных транспартных зносін, але гэта не перашкаджае людзям быць у курсе спраў суседзяў. Старасты і актывісты з'яўляюцца злучальным звяном паміж насельніцтвам і органамі мясцовага кіравання і самакіравання, ствараюць умовы для развіцця грамадскай ініцыятывы і прыцягваюць аднавяскоўцаў да вырашэння праблем мясцовага значэння.

Напрыклад, у вёсцы Вялікія Бялевічы з дапамогай грамадскасці добраўпарадкавана паркавая зона: зроблены альтанкі, лаўкі і нават дзіцячая пляцоўка. Будаўніцтва апошняй ініцыявалі шматдзетныя маці. Вольга Курдыль, якая выхоўвае пяцярых дзяцей, стала адным з актыўных натхняльнікаў і рэалізатараў ідэі. У вёсцы болей за 50 дзяцей, але тут амаль няма сацыяльных аб'ектаў. І дзіцячая пляцоўка была проста неабходная. Да ініцыятыўных бацькоў далучыўся мясцовы фермер Уладзімір Укружскі, які на сваёй пілараме зрабіў усе неабходныя нарыхтоўкі за ўласны кошт.

У аграгарадку Семукачы праблем з пітной вадой няма, жыхары карыстаюцца цэнтралізаваным водазабеспячэннем. Але стала шкада, што прападае калодзеж. Ён быў выкапаны дзесяць гадоў таму і стаяў закінуты. Мясцовы жыхар Рыгор Венгерэнка ўзяўся за арганізацыю работ па яго аднаўленні. У выніку натхнёныя ім актывісты зрабілі агаловак (наземную частку калодзежа), пафарбавалі яго і купілі вядро.

А ў Паўлаўску вярнулі да жыцця дзве крыніцы. Кажуць, што адной з іх было сто гадоў, не меней. Зруб унутры яе ўжо згніў, таму актывісты зрабілі новы. А другую крынічку ледзь знайшлі. Старажылы ўзгадалі, што ёй карысталіся яшчэ іх продкі. Яе пачысцілі і акультурылі з удзелам усё таго ж фермера Уладзіміра Укружскага. Цяпер сюды па ваду ездзіць палова сельсавета.

Вялікая работа зроблена па добраўпарадкаванні могілак. Вёска Алень сёння амаль выміраючая, а раней была досыць вялікай. Нават працягласць яе каля пяці кіламетраў. Цяпер тут у асноўным жывуць дачнікі. Вясковыя могілкі былі ў вельмі непрывабным стане, і жыхароў гэта непакоіла. Старшыня сельсавета прапанавала зрабіць капітальную прыборку. Мясцовыя арганізацыі дапамаглі выразаць аварыйныя дрэвы і хмызняк. Адкрыццём стала, што на самых старых могілках стаялі валуны. На іх не засталося ніякіх апазнавальных знакаў, але старажылы сцвярджаюць, што гэта былі своеасаблівыя помнікі. Людзі з дапамогай тэхнікі перанеслі іх на ўскраек могілак, устанавілі там крыж і такім чынам утварыўся агульны памятны знак у гонар продкаў. Цяпер да яго прыносяць кветкі.

Памятны знак ў вёсцы Алень.

А на могілках у Вялікіх Бялевічах жыхары аднавілі нават помнік XIX стагоддзя. Ён ляжаў у хмызняку і быў напалову пашкоджаны вандаламі. Высветлілася, што яго ўсталявалі на пахаванні тутэйшага пана Пятра Гайдукова. Дарэчы, на помніку пазначана, што ён быў зроблены ў маскоўскай майстэрні. Яго паднялі, пачысцілі і замацавалі. А мясцовы жыхар на свае грошы паставіў металічную агароджу.

— Асабліва вызначыліся ў навядзенні парадку стараста Таццяна Сімакова і Тамара Бельская, — кажа **Тамара УКРУЖСКАЯ, старшыня Семукацкага сельвыканкама.** — І такіх, як яны, ініцыятыўных, у нас шмат. Два гады таму, калі я ўзначаліла сельсавет, адразу ж патлумачыла людзям, што якасць нашага жыцця шмат у чым залежыць ад нас саміх. Разам мы прыдумалі праект «Вяртанне да вытокаў» і пад яго эгідай сталі наводзіць парадак у вёсках. Спачатку людзі неахвотна здавалі грошы, але, калі ўбачылі, што эфект ёсць, сталі самі прапаноўваць ідэі для рэалізацыі. За гэты час агульнымі намаганнямі зроблена шмат. Галоўнае — шчырае жаданне саміх жыхароў. Мы праводзілі сельскія сходы, выяўлялі праблемы, выслухоўвалі прапановы грамадзян, шукалі шляхі вырашэння праблем. У выніку за сродкі грамадзян і з іх удзелам агароджаныя і пафарбаваныя сем грамадзянскіх могілак, чатыры з якіх прыводзіліся ў парадак упершыню. Насельніцтва за свой кошт адрамантавала 24 агалоўкі на шахтавых калодзежах, добраўпарадкавала крыніцу. Праведзеныя за грошы жыхароў і з іх удзелам работы ацэньваюцца ў пяць тысяч рублёў. Вядома, што без дапамогі з боку камунальных, сельскагаспадарчых і лясных службаў было б немагчыма зрабіць такі фронт работ. Не засталіся ўбаку сацыяльныя службы і Семукацкая сярэдняя школа. Разам мы зрабілі нашы вёскі больш прыгожымі і ўтульнымі. Радуе, што ініцыятыўных грамадзян становіцца ўсё больш. І ўжо не мы да іх, а яны да нас ідуць з прапановай зрабіць нешта яшчэ.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота Тамары УКРУЖСКАЙ.

Мясцовы жыхар Рыгор ВЕНГЕРЭНКА дэманструе абноўлены ў Семукачах калодзеж.

Тэлесеткі

Доўгая дарога ў Ратэрдам

Сёння бліжэй да поўначы вызначыцца пераможца нацыянальнага адбору на песенны конкурс «Еўрабачанне». Яго падчас фінальнага гала-канцэрту выберуць па формуле 50/50 тэлегледачы і прафесійнае журы.

Нагадаем, сёлета да фінальнага этапу дайшлі 12 удзельнікаў, якія прадставяць свае конкурсныя нумары ў наступным парадку: 1) Napoli; 2) Саша Захарык; 3) Настасся Малашкевіч; 4) Chakras; 5) Настасся Гламозда; 6) Nastasea (Настасся Развадоўская); 7) Ян Яраш; 8) Анжаліка Пушнова; 9) Дар'я Хмяльніцкая; 10) «Аўра»; 11) КейСі; 12) VAL. Кожнага з іх тэлевізійнікі прадставяць гледачам з дапамогай відэавізітовак, дзе выканаўцы раскрыюць сябе праз пэўныя колеры і імправізаваныя танцы.

Убачыць і пачуць прамую трансляцыю выступленняў змогуць гледачы тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24», слухачы «Радыус FM», а таксама наведвальнікі афіцыйнага сайта Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by.

Ужо 1 сакавіка ў тэлеэфіры пачнуць выходзіць «Дзённікі Еўрабачання», якія раскажуць больш падрабязна і аб прадстаўніку нашай краіны, і наогул пра тое, як праходзіць падрыхтоўка да міжнароднага конкурсу. А 2 сакавіка задаць свае пытанні пераможцу нацыянальнага адбору можна будзе падчас анлайн-канферэнцыі, што пройдзе ў медыяхолдынгу.

Нагадаем: хто б ні стаў беларускім удзельнікам «Еўрабачання-2020», ужо вядома, што прадстаўнік Беларусі выступіць на конкурсе ў першай палове першага пяўфіналу, 12 мая, разам з артыстамі Паўночнай Македоніі, Літвы, Швецыі, Славеніі, Аўстраліі, Ірландыі, Расіі, Нарвегіі, Харватыі, Кіпра, Азербайджана, Мальты, Ізраілю, Украіны, Румыніі і Бельгіі. З нашых суседзяў ужо выбралі сваіх удзельнікаў Украіна (гурт Go_A з песняй «Салавей») і Літва (гурт The Roop), у найбліжэйшыя дні мусіць вызначыцца з канкурсантам і Расія.

Наогул у 65-м міжнародным песенным конкурсе, які пройдзе 12—16 мая ў Ратэрдаме (Нідэрланды), удзельнічаюць сёлета выканаўцы з 41 краіны, прычым Балгарыя і Украіна вярнуліся пасля гадавога перапынку, а Венгрыя і Чарнагорыя адмовіліся ад удзелу з фінансавых прычын. Дэвіз юбілейнага «Еўрабачання» — «Open Up» («Адкрыйся»), а новы лагатып — кола, складзенае са сцягоў краін-удзельніц.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота eurovision.tv.

АМАТАРАМ ЛІТАРАТУРНАЙ КЛАСІКІ...

Канал «Культура» Беларускага радыё працягвае радаваць прыхільнікаў класічнай літаратуры. У праграме «Літаратурная анталогія» цяпер гучыць кніга народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце», дзе лёс галоўных герояў — гэта лёс усяго пакалення, што прайшло праз жудасныя выпрабаванні вайны. Выканаўца — артыстка Маргарыта Захарыя.

— Дадзены выпуск прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі, гераізму тых, хто змагаўся з ворагам на франтах і ў партызанскіх атрадах. Кніга Івана Шамякіна нагадвае, наколькі важна захоўваць мір на зямлі, а таксама ведаць сваю гісторыю, каб не паўтарыць памылак перажытага. Чытанне твора працягнецца і ў маі, акурат у дні асноўных урачыстасцей, прысвечаных Перамозе, — кажа дырэктар канала «Культура» Уладзімір Трапянок.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 108

З 15 да 21 лютага ў РЦАП па шахматах і шашках адбылося маладзёжнае першынство Беларусі па шашках-64. Чэмпіёнамі ў розных узростах сталі: Кацярына Целяўная (Гродна, Д11), Аляксей Паўлючэнка (Мінск, Ю11), Дар'я Нікіфарава (Мінск, Д14), Арцём Ціханаў (Ваўкавыск, Ю14), Вікторыя Нікалаева (Мінск, Д17), Марат Леў (Слонім, Ю17), Яна Якубовіч (Мінск, Д20), Іван Трубнікаў (Мінск, Ю20), Вера Хвашчынская (Бабруйск, Д27), Віталь Новікаў (Ю27, Мінск).

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі самабытнага шашачнага кампазітара Валерыя Свідзінскага, міжнароднага майстра з Мінска.

№ 20



№ 20

Белыя простыя шашкі: e1, g1, d2, f2, g3, b4 (6).

Чорныя простыя шашкі: h4, a5, e5, g5, h6, e7 (6).

№ 21

Белыя простыя шашкі: h2, c3, b4, d4, f4, e5 (6).

Чорныя простыя шашкі: g3, d6, h6, c7, e7, g7, h8 (7).

Яшчэ дзве пазіцыі па правілах бразільскіх шашак складзеныя вядучым аддзела.

№ 22

Белыя простыя шашкі: c1, e1, g1, b2, e3, g3, b4, a5 (8).

Чорныя простыя шашкі: a3, c5, e5, g5, d6, c7, g7, d8 (8).

№ 23

Белыя простыя шашкі: b2, f4, g1, g3, h4 (5).

Чорныя простыя шашкі: a3, d4, d6, f6, h6 (5).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 107 ад 14.02.2020.

№ 17 10... e7-d6 11. c5xe7 e5-f4 12. g3xe5 g7-h6 13. e5xg7 h6xf8xd6 14. h4xf6 b6-c5 15. d4xb6 +

№ 19 1. g3-f4 e5:g3 2. e3-d4 c5:e3 3. e1-d2 a3:c5 4. d2:f8+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013,

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

ДАЧНЫ АДПАЧЫНАК І ЧАС У ДОБРАЙ КАМПАНІІ

Каляндарная вясна літаральна праз некалькі дзён уступіць у свае правы, і ў прыродзе пачнецца абнаўленне. Таму самы час звярнуць увагу на тэлепраекты, якія дазволяць і нам даведацца нешта новае і правесці час у кампаніі карысных суразмоўцаў.

Так, на тэлеканале «Беларусь 1» з 7 сакавіка распачнецца сёмы сезон папулярнага праекта «Дача» вытворчасці тэлерадыёкампаніі «Магілёў». Упершыню праграма з'явілася на тэлебачанні вясной 2014 года і стала сапраўдным памочнікам для беларускіх дачнікаў, таму што для многіх з нас класічныя «шэсць сотак» — не проста дом у вёсцы, а цэлая філасофія жыцця. Вядучая праграмы Алена Іванова ў кампаніі аператара Юрыя Аўласцава працягне свае вандроўкі па Беларусі і зноў стане апавядаць гледачам пра сакрэты загараднага жыцця.

Здымачная група будзе ладзіць сустрэчы са спецыялістамі ў профільнай сферы, якія падзеляцца карыснай інфармацыяй, дадуць каштоўныя парады і рэкамендацыі, а таксама параяць, як правільна даглядаць расліны, выбіраць патрэбныя ўгнаенні, рыхтаваць насенне і многае іншае. Кожная тэлевізійная паездка стане знаёмствам з новымі сартамі раслін, якія можна знайсці ў нашых краях, а таксама даследаваннем звыклых традыцыйных культур, што дазволіць дачнікам-аматарам убачыць вядомае ў новым ракурсе.

«Мы будзем расказваць тэлегледачам, як правільна садзіць гіганцкую цыбулю сорту Эксібішэн, адметную смакам і тонкім водарам. Што цікава, пры разробліванні гэтай агародніны слёзы праліваць не давядзецца, бо яна не мае горычы», — дзеліцца падрабязнасцямі першага выпуску новага сезона вядучая праекта «Дача» Алена Іванова.

Акрамя гэтага, у першым выпуску тэлеаўдыторыя даведаецца, як правільна прымяняць кірунак urban jungle ў інтэр'еры і стварыць утульнасць у доме з дапамогай раслін. Знойдзецца месца і варажбе: разам з гасцямі праграмы аўтары «Дачы» паспрабуюць з дапамогай насення і пладоў розных культур вызначыць, наколькі будзе ўраджайны год і што варта садзіць ужо ў найбліжэйшы час.

Па-ранейшаму стваральнікі праграмы будуць падтрымліваць зваротную сувязь з гледачамі. Тут заўсёды гатовыя выслухаць і даць параду дачнікам, якія тэлефануюць у рэдакцыю, бо многія апавядаюць пра свой вопыт і потым становяцца героямі праекта. І цяпер, кажуць стваральнікі «Дачы», кожнаму з тых, да каго ў госці яны завітаюць, будзе дадзена ацэнка. А мы нагадваем, што атрымаць кансультацыю ад праграмы ці падзяліцца сваімі наватарскімі распрацоўкамі можна, звярнуўшыся на тэлефон 8 (0222) 28 47 77 альбо даслаўшы ліст на электронную пошту: dacha@tvrmogilev.by. А галоўнае, не забудзьцеся, што ўжо 7 сакавіка на «першай кнопцы» распачнецца новы дачны сезон 2020 года і кожную суботу праграма будзе чакаць вас на спатканне.

На «Беларусь 3» чакаецца прэм'ера новага праекта «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам». Ужо ў аўторак 3 сакавіка выйдзе першы выпуск з 8-серыйнага цыкла пра беларускае тэлебачанне 70—90-х гадоў, дзе гледачы зладзяць памятнае падарожжа ў мінулае і згадаюць знакавыя праграмы і майстроў айчыннага тэлеэфіру. Вядучы і аўтар — Барыс Герстэн, журналіст і сцэнарыст, які сам аддаў рабоце на тэле-

бачанні амаль палову стагоддзя, асабіста ведаў усіх герояў праграмы «Рэдакцыя»: з кімсьці сябраваў, а з іншымі працаваў разам. Пры ім і з яго непасрэдным удзелам ствараліся і выходзілі ў эфір тыя праекты, якія і сёння засталіся на слыху і ў памяці пакаленняў. Гісторыі вядучага будуць дапоўнены ўспамінамі сучаснікаў — дзеячаў культуры і супрацоўнікаў тэлебачання, а таксама рэдкімі архіўнымі кадрамі з фондаў Белтэлерадыёкампаніі.

У сутнасці канфлікту ў свой час разбіраўся былы старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка. Ён даручыў стварыць адпаведную камісію. А да высвятлення ўсіх абставін прыпыніць дзейнасць прадпрыемства. У свой час МНС выявіла на лесапільні шматлікія парушэнні. І падало іск у эканамічны суд аб прыпыненні яе дзейнасці. «Але ўсе парушэнні даўно ўстаранёны, у сувязі з гэтым само МНС прыпыніла судовае пасяджэнне. І суд пастанавіў адмовіць у задавальненні іску. Акрамя таго, я ўстанавіў некалькі шчытоў, якія паглынаюць шум, затрымліваюць апілкі. Але адны і тыя ж грамадзяне працягваюць скардзіцца, на прадпрыемства пастаянна прыязджаюць праверкі, камісіі. Таму лесапільня не можа дзейнічаць на поўную моц. Пры максімальнай загрузцы тут могуць працаваць да трыццаці чалавек, сцвярджае прадпрымальнік.

Віктар Турын звяртаўся па дапамогу і **да памочніка Прэзідэнта — інспектара па Мінскай вобласці Ігара ЯЎСЕЕВА**, які, выслухаўшы заяўніка, рэзюмаваў: «Неабходна паглядзець, якім чынам выдавалі зямельныя ўчасткі пад ўзвядзенне жылых дамоў. Ці ёсць заключэнне эколагаў, пажарных, санітарнай і землеўпарадкавальнай службы. Як можна было адначасова адобрыць і лесапільню, і жылле? Навошта было ствараць праблему? Прайдзіце грамадскае абмеркаванне. І калі людзі вас падтрымаюць, то будзе ўсё добра. Вы ж правільна ўсё афармілі».

Як расказала **старшыня Перасадскага сельвыканкама Вольга КАРЧМАР**, сапраўды, Віктар Турын падаў дакументацыю на грамадскае абмеркаванне. Была створана камісія па ацэнцы ўздзеяння вытворчасці на навакольнае асяроддзе з удзелам прадстаўнікоў усіх зацікаўленых службаў. Спецыялісты ўнеслі ў справаздачу свае заўвагі і карэкціроўкі. Не засталіся без увагі і прапановы мясцовых жыхароў. Праектна-каштарысная дакументацыя вернутая на дапрацоўку.

Дадам, што далёка не ўсе жыхары вёскі Струпень супраць работы лесапільні, якая забяспечвае рабочымі месцамі і танным палівам каля ста дамоў.

> Як можна было адначасова адобрыць і лесапільню, і жылле? Навошта было ствараць праблему?

— Мы стала тут пражываем, а вось тыя, хто скардзіцца, бываюць тут сезонна, — кажуць яны. — Без Віктара Іванавіча мы не ведаем, што б рабілі. Ён нікому з нас ніколі не адмовіў у дапамозе дровамі, якія прывозіць сваім транспартам. Зімой ён чысціць дарогу ад снегу тэхнікай, а яшчэ адрамантаваў мост, які літаральна разваліваўся.

У мяне пяцёра дзяцей, — канстатавала **Валянціна ЛОБАЧ.** — Я пастаянна бяру дровы ў Віктара Іванавіча. Дзякуй яму за тое, што мае малыя жывуць у цяпле.

> У свой час МНС выявіла на лесапільні шматлікія парушэнні. І падало іск у эканамічны суд аб прыпыненні яе дзейнасці. «Але ўсе парушэнні даўно ўстаранёны, у сувязі з гэтым само МНС прыпыніла судовае пасяджэнне. І суд пастанавіў адмовіць у задавальненні іску.

— Ці не лепш сесці за стол перагаварыць з Віктарам Турыным і спакойна, без эмоцый, абмеркаваць сітуацыю і знайсці паразуменне. Дрэнны мір лепш добрай вайны, — лічаць у Струпені.

Згодны з гэтым і **старшыня Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пётр НАВІЦКІ**:

— Лесапільня працуе больш дзесяці гадоў. Доўгі час прадпрыемства і жыхары бліжніх да яго дамоў суіснавалі мірна. Супрацьстаянне пачалося, калі Турын пачаў пашыраць вытворчасць. Я неаднаразова выязджаў на месца адзін, з камісіяй, каб уладзіць канфлікт. А для гэтага неабходна знайсці кампраміс. Ды ісці на яго бакі не хочуць. Сапраўды, вёска раздзялілася на два лагеры: «за» і «супраць» вытворчасці. Тых, хто падтрымлівае Віктара Турына, зразумець таксама можна. Людзі кажуць, што прадпрымальнік дае ім работу, магчымасць фінансава забяспечваць сем'і. Разам з тым мы жывём у прававой дзяржаве, і гэта праблема павінна вырашацца ў прававым полі — у судзе, пракуратуры, на ўзроўні заканадаўства.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Яловица, д. Осово Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	**30 марта 2020 года, в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3	**Продавец и его адрес**	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881715101000118 в дер. Яловица. **Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,0884 га с кадастровым номером 624881710301000043 в дер. Осово
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	**Начальная цена продажи**	**Лот № 1** – 8000,00 руб.; **Лот № 2** – 3000,00 руб.
8	**Условия проведения аукциона**	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь; В) наличие не менее двух участников; Г) без права предоставления рассрочки
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	Лот № 1(в населенном пункте имеется газоснабжение); Лот № 2 (возможность подключения центрального водоснабжения)
10	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»)
11	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Рабочие дни (с 08.00 до 17.00)
12	**Начало подачи заявлений**	**С 28 февраля 2020 года** с 8.00 до 17.00, каб. № 4
13	**Окончательный срок приема заявлений**	**26 марта 2020 года** до 17.00
14	**Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона**	Внесение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе, расходов связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и внесение платы за земельный участок; осуществление победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, в установленном порядке, технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоения) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него
15	**Контактные телефоны**	8-01775 67-449, 8-01775 67-174

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: лот № 1 – 1999,71 руб.; лот № 2 – 2055,67 руб. (затраты без учета стоимости информационного сообщения).

Затраты на строительство, в том числе на проектирование объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

Отчет о деятельности фонда «Страна замков» за 2019 г.

МКФ «Страна Замков» зарегистрирован в мае 2005 года. Основными целями и задачами фонда являются пропаганда и популяризация истории и культуры Беларуси. Учредитель фонда – Варикиш Александр Иосифович. Уставный фонд на 31 декабря 2019 г. составляет 6 тысяч рублей. На 1 января 2020 года основные средства составили 12 930 рублей. Общий объем выполненных работ за 2019 год – 117,2 тысячи рублей. Затраты для реализации программ – 115,26 тысячи рублей. Налог на добавленную стоимость – 0,135 тысячи рублей. Балансовая прибыль за 2019 год – 1,8 тысячи рублей. Списочная численность работающих в МКФ «Страна Замков» за 2019 год – 4 человека, фонд заработной платы – 20,2 тысяч рублей.

УНП 690682807

ВАЙНА ПАКІНУЛА ЯМУ ЖЫЦЦЁ, АЛЕ ЗАБРАЛА БЛІЗКІХ

75 Вялікая Перамога

Выдавецкі дом «Звязда» і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Святлана Шутава павіншавалі клічаўскага ветэрана вайны са святам абаронцаў Айчыны

Нягледзячы на свае 96, Міхаіл Фельдман выглядае на зайздрасць бадзёрым і маладжавым. Вядома, што гады бяруць сваё і здароўе часам пакідае жадаць лепшага. Але Міхаіл Давыдавіч аптыміст, ён шмат чытае, адсочвае падзеі ў краіне і за яе межамі — адным словам, жыве поўным жыццём. Разам з дэпутатам і карэспандэнтам «МС» да ветэрана завіталі прадстаўнікі мясцовай улады, ветэранскай арганізацыі і медыцыны. З нагоды ён апрануў свой парадны пінжак з баявымі ўзнагародамі — ордэнам Вялікай Айчыннай вайны і медалямі за Перамогу над Германіяй і Японіяй.

Ветэран расказвае Святлане ШУТАВАЙ пра сваё жыццё.

Што турбуе ветэрана

Дэпутат Святлана Шутава спецыяльна арганізавала гэтую сустрэчу, каб бліжэй пазнаёміцца з ветэранам. Падчас размовы з выбаршчыкамі ў сваёй акрузе яна даведалася, што ў вёсцы Акцябрск жыве такі паважаны чалавек. Ёй перадалі, што ён вельмі б жадаў сустрэцца са сваім дэпутатам і яна не стала адкладваць гэты візіт. Да добрага жэсту далучыўся і Выдавецкі дом «Звязда». Перад тым як пачаць размову «за жыццё», дэпутат падарыла ветэрану прысмакі і радыёпрыёмнік, па якім ён зможа слухаць, у тым ліку і мясцовыя навіны. А карэспандэнт «МС» перадала ад Выдавецкага дома «Звязда» шыкоўныя маляўнічыя альбомы пра гераічнае мінулае беларускага народа і яго подзвіг падчас Вялікай Айчыннай вайны. Трэба адзначыць, што падарункі прыйшліся ветэрану даспадобы.

Як чалавек актыўны і неабыякавы да ўсяго, што адбываецца навокал, Міхаіл Давыдавіч хоча неяк паўплываць на рэчаіснасць. Яго вельмі турбуе лёс роднай вёскі. Калісьці тут жыло шмат людзей, а цяпер засталося ўсяго некалькі дзясяткаў. Раней у вёсцы былі клуб, бібліятэка, школа, пошта, аддзяленне сувязі, стацыянарная крама, ФАП, але паступова ўсе гэтыя сацыяльныя аб'екты зніклі.

На вуліцы, дзе жыве ветэран, знешне ўсё прыстойна. Няма паўразбураных пустуючых хат, нахіленых платоў, зараснікаў. Але жыццё не б'е тут ключом. Вось і Міхаіл Давыдавіч скардзіцца, што жыццё стала зусім іншым, што людзі адасобіліся, зачыніліся ў сваіх хатах. А ён да гэтага не прывык. Кампенсуе недахоп зносінаў праглядам тэлеперадач.

Паскардзіўся былы франтавік і на стан здароўя. А ў сувязі з гэтым панаракаў на закрыццё ФАПа. Закон не парушаны, але ж людзям нязручна. З іншага боку, тэлефон пад рукой, звязацца з паліклінікай або бальніцай не праблема. Вось і ўрач з Клічава Валянціна Бялко, якая завітала да ветэрана разам з намі, добра ведае пра балячкі пацыента.

Дарогамі вайны

Пра франтавое мінулае ветэран не раз расказваў і школьнікам, і навучэнцам каледжа, і грамадскасці. Але яно яго і цяпер не адпускае. Бо столькі пакут і выпрабаванняў выпала, што хопіць і на дзесяцярых.

— Калі вайна пачалася, я спачатку спадзяваўся, што ўсё хутка скончыцца, але фронт у лічаныя дні дакаціўся да Бабруйска, — узгадвае ён. — Мой бацька быў удзельнікам Першай сусветнай вайны і параіў ісці ў армію добраахвотнікам. Мне на той час было 17 гадоў. Ваенкамат у Клічаве быў зачынены і я з яшчэ двума сваімі аднагодкамі паехаў у Магілёў. Там нам загадалі заставацца ў тыле. Сяк-так дабраліся да Оршы, адтуль на параходзе ўглыб Расіі, а потым на конях даехалі да Башкіріі. Я хлопец сельскі, работы не баяўся і таму застаўся працаваць у калгасе «Другая пяцілетка». Працавалі там адны жанчыны і я ім стаў добрым памочнікам. Вазілі хлеб на конях на адлегласць 120 кіламетраў. Але хутка мяне накіравалі спачатку ў працоўную, а потым дзеючую армію. Марыў стаць лётчыкам, але камісію не прайшоў з-за зроку. Стаў сувязістам. У Свярдлоўскай вобласці шэсць месяцаў вучыўся марзянцы, пасля чаго ў званні малодшага сяржанта быў накіраваны на фронт. Ваяваў у 13-м асобным лінейна-эксплуатацыйным батальёне сувязі.

Ваенны шлях маладога сувязіста пачынаўся з Пскоўскай вобласці, потым ён будаваў лініі сувязі ў Прыбалтыцы і Польшчы. Перамогу Міхаіл сустрэў у Беластоку. А потым іх батальён пасадзілі ў эшалон і павезлі ў Харбін.

З жонкай пазнаёміўся ў Манчжурыі

Гэта адбылося ў 1945 годзе.

— Мая Алена Васілеўна таксама ўдзельніца вайны, выдатнік сувязі, — з пяшчотай у голасе кажа ветэран. Жонкі ўжо 20 гадоў няма побач, і былы салдат вельмі балюча перажывае гэтую страту. Ён дэманструе фота 75-гадовай даўніны, зробленае ў тым самым кітайскім Харбіне. Там жа Міхаіл перажыў не толькі самыя шчаслівыя хвіліны свайго жыцця, але і самае вялікае гора. На яго неаднаразовыя спробы высветліць лёс бацькоў, шматлікіх братоў, сясцёр і іншых сваякоў — усяго сямнаццаці чалавек, якія засталіся ў Клічаўскім раёне, прыйшоў страшны адказ: іх усіх расстралялі.

— З сям'і я адзін застаўся, нават не ведаю, дзе яны пахаваныя, — яго голас і цяпер дрыжыць ад хвалявання. — Мяне выратавала толькі тое, што я пайшоў на фронт. Пасля таго як даведаўся пра лёс родных, вяртацца да дому не захацелася. Мне напісалі, што іх выдалі паліцаі. Я проста б не змог жыць побач з гэтымі здраднікамі. Таму, калі мабілізаваўся, паехаў на радзіму жонкі ў Тульскую вобласць. І толькі ў 60-я гады вярнуўся ў Клічаўскі раён. Працаваў настаўнікам у Колбчы, выкладаў усё, пачынаючы ад матэматыкі, заканчваючы нямецкай мовай. І ўвесь час шукаў сляды забітых родных. На жаль, безвынікова. З кнігі «Памяць» Клічаўскага раёна толькі і даведаўся, што ў раёне немцы расстралялі 400 яўрэяў...

Ветэран лічыць, што яшчэ не ўсё сказана пра вайну і трэба часцей нагадваць пра тых, хто пацярпеў ад яе. Каб моладзь разумела, што героі — гэта не толькі тыя, хто клаўся на амбразуру. Перамога — справа агульная, яна здабывалася сумеснымі дзеяннямі арміі і мірнага насельніцтва. Ён марыць, што з часам у Клічаве з'явіцца вялікая памятная дошка, дзе будуць пазначаны імёны не толькі тых жыхароў, якія загінулі на фронце, але і тых, каго забілі падчас акупацыі.

А яшчэ ён вельмі ўдзячны ўсім, хто яго не забывае, падтрымлівае. Асабліва адзначае старшыню сельсавета Дзмітрыя Рамановіча, які дапамог яму і хату афарміць, і ваду падвесці, і траву абкасіць вакол агароджы. Дзеці, вядомая справа, не забываюць, дапамагаюць спраўляцца па гаспадарцы. На жаль, з пяцярых засталося ўжо толькі трое, але ёсць унукі і праўнукі. І гэта таксама дае сілы жыць.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
Клічаўскі раён.

Фота аўтара.

У тэму

Святлана ШУТАВА, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Міхаіл Фельдман — унікальны чалавек. Вельмі парадавала, калі даведалася, што ён вядзе актыўны лад жыцця, цікавіцца ўсім, што яго атачае. Сёння вельмі актуальна тэма 75-годдзя Перамогі, патрыятызму, любові да Радзімы, а Міхаіл Давыдавіч якраз адзін з тых людзей, жыццё якіх з'яўляецца прыкладам для пераймання. Для мяне вялікі гонар пагутарыць з такім чалавекам, даведацца пра яго праблемы і вырашыць іх. Я абавязкова звярнуся да гісторыкаў, іншых кампетэнтных асоб, каб дапамагчы Міхаілу Давыдавічу высветліць усё, што магчыма, пра яго родных, якія загінулі падчас вайны. У дэпутацкай рабоце вельмі важна пачуць чалавека, разабрацца, як узнікла праблема, што трэба зрабіць для яе вырашэння.

Дзмітрый РАМАНОВІЧ, старшыня Колбчанскага сельсавета Клічаўскага раёна:

— На нашай тэрыторыі застаўся ўсяго адзін ветэран. На жаль, вёска, дзе ён жыве, выміраючая. З 75 чалавек толькі 43 —працаздольнага ўзросту. Частка з іх перыядычна не працуе, бо не мае жадання, астатнія занятыя ў мясцовых гаспадарках. Дзяцей да 18 гадоў не засталося наогул. Ветэрану сумна, але ў раёне жыве яго дачка, унукі і праўнукі. Я са свайго боку заўсёды на сувязі з Міхаілам Давыдавічам, дапамагаю, чым магу. Ён жыве адзін і трэба, каб была пастаянная ўвага. Такія жыхары ў нас на асаблівым кантролі.

ЧЫТАЧ — ГАЗЕТА

ЦІ ПАТРЭБНЫ РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ДРАЙВЕРЫ РОСТУ?

З вялікай цікавасцю пазнаёміўся з матэрыяламі, якія былі надрукаваныя ў «МС» (7 лютага 2020 года) па выніках круглага стала на тэму «11 цэнтраў прыцягнення — рэгіянальныя драйверы росту».

4 ЭКСПЕРТНЫ АСЯРОДАК

РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ДРАЙВЕРЫ РОСТУ ЦІ ДОНАРЫ?

ЭКСПЕРТНЫ АСЯРОДАК 13

Сам факт абмеркавання рэгіянальнай праблематыкі выклікае адабрэнне. Перакананы, што адна з цэнтральных і слаба даследаваных праблем арганізацыі жыцця краіны (ды і свету ўвогуле) — гэта яе празторавая арганізацыя. Звязана гэта з тым, што яе рашэнне павінна абапірацца на разуменне не толькі натуральных тэндэнцый развіцця грамадства, але і самых розных унутраных і знешніх фактараў: геапалітычных, эканамічных, сацыяльных, экалагічных і іншых.

Удзельнікамі круглага стала было выказана шмат цікавых думак. Напрыклад, з тым, што цэнтры прыцягнення фарміруюцца натуральным чынам і, як правіла, вакол буйных гарадоў, нельга не пагадзіцца. З'яўляецца аксіёмай той факт, што буйныя гарады, а пазней мегаполісы ўзнікалі самі па сабе. Сёння мы канстатуем, што адбываецца не проста рост насельніцтва ў гарадах, а яго канцэнтрацыя ў асобных буйных гарадскіх агламерацыях. Гэта датычыцца як свету ўвогуле, так і Беларусі. І такі рост будзе няўмольна працягвацца — ён непазбежны і звязаны з прынцыповымі тэхнічнымі зрухамі і структурнай перабудовай эканомікі. Пераход да новых высокатэхналагічных вытворчасцяў выклікае не проста рух насельніцтва, а міграцыю іх у буйныя гарады. Таму любыя адміністрацыйныя рашэнні, якія не ўлічваюць працэсы натуральнай самаарганізацыі, не толькі малаэфектыўныя, але і небяспечныя. Час усвядоміць, што асноўная частка насельніцтва Беларусі, як цяпер, так і ў будучыні, будзе жыць у буйных гарадах. Чаму? Таму што працэс канцэнтрацыі насельніцтва — гэта закон развіцця цывілізацыі. Людзі збіраюцца разам не таму, што ім гэта падабаецца, а таму, што гэта эканамічна мэтазгодна. Я не сцвярджаю, што гэта добра, але гэта рэальнасць і яе трэба прыняць. Таму не драйверы трэба вызначаць, а займацца паляпшэннем умоў жыцця ў сельскай мясцовасці краіны, малых гарадскіх пасяленняў, каб не засталіся пакуль яшчэ жывыя вёскі і пасёлкі без увогуле людзей. Вось і ўдзельнік круглага стала Міхаіл Русы сцвярджае, што «самае важнае — стварыць умовы, каб чалавек меў магчымасць зарабляць». Пільнай увагі патрабуюць таксама буйныя гарады краіны і найперш Мінская агламерацыя. Аднак тут асноўныя акцэнты павінны быць скіраваны на ўнутраны свет чалавека. Справа ў тым, што жыццё ва ўмовах звышвысокай канцэнтрацыі насельніцтва ў адрыве ад прыроды кардынальна змяняе яго сістэму каштоўнасцяў, духоўны свет, псіхіку, не кажучы ўжо пра фізічнае здароўе. Такой агрэсіі, якую нярэдка можна сустрэць сёння сярод жыхароў (не толькі Беларусі), раней не было. Зразумела, што без увагі не могуць заставацца і экалагічныя пытанні, асабліва праблема смецця. Паміж гэтымі часткамі я бачу цесную сувязь. Вобразна кажучы, «таксічнасць гарадскога асяроддзя робіць таксічнымі адносіны паміж людзьмі і саміх людзей».

Яшчэ адно слушнае меркаванне ўдзельнікаў круглага стала — роля міграцыйнага руху насельніцтва ў кантэксце фарміравання рэгіянальных драйвераў. Глыбока перакананы ў тым, што ў такой кампактнай краіне, як Беларусь, з яе адносна высокай шчыльнасцю дарожнай сеткі і адносна раўнамерным размеркаваннем буйных прамысловых цэнтраў, адным з галоўных кірункаў паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі краіны павінна стаць міграцыя насельніцтва і перамяшчэнне прадпрымальніцтва з мэтай скарачэння адлегласці да рынкаў. Менавіта на гэтую акалічнасць звярталі ўвагу аўтары даклада аб сусветным развіцці за 2009 год: «Рост гарадоў, міграцыя насельніцтва і гандаль сталі каталізатарам прагрэсу ў развітых краінах за апошнія два стагоддзі». На жаль, не ўсе ўдзельнікі круглага стала глядзяць на міграцыю «маімі вачыма» і вачыма аўтараў даклада. Аднак Аляксандр Чубрык адзначае, што «людзі гатовы кудысьці ездзіць, і для іх трэба стварыць нармальную лагістыку і транспартнае забеспячэнне». Таму заканамерным, на маю думку, было б лепш укласціся ў лагістыку, чым праектаваць рэгіянальныя драйверы. Такі падыход (маецца на ўвазе маятнікавая міграцыя) больш поўна будзе адпавядаць як інтарэсам саміх людзей (не трэба зрывацца з «наседжаных» месцаў, захаваецца больш цесная сувязь з прыродай і інш.), так і дзяржаўным інтарэсам (захоўваецца большая раўнамернасць пры размяшчэнні прадукцыйных сіл, змяншаецца вастрыня антрапагеннай нагрузкі на прыродны комплекс і гэтак далей).

Ёсць меркаванні ўдзельнікаў круглага стала, з якімі пагадзіцца нельга, і датычацца яны неабходнасці навучаць людзей на месцах. Аднак вядома, што самыя лепшыя ўніверсітэты свету размешчаны не паўсюдна, яны канцэнтруюцца, як правіла, у буйных гарадах. Высокай якасці адукацыю не дасць універсітэт, які мы створым у Салігорску, ды ён там і не патрэбны. Гэты горад «завязаны» практычна на адзін від эканамічнай дзейнасці — вытворчасць мінеральных угнаенняў. І потым, ужо сёння ў краіне працуюць, акрамя абласных і сталічнага, такія рэгіянальныя ўніверсітэцкія цэнтры, як Баранавічы, Пінск, Наваполацк, Мазыр, Горкі. Пры гэтым нельга забывацца аб тым, што навучанне ў сталіцы, буйных гарадах Беларусі, акрамя атрымання адукацыі, пашырае кругагляд чалавека, робіць яго камунікатыўна актыўным.

На жаль, удзельнікамі круглага стала зусім не закранута праблема неабходнасці змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу (АТП) Беларусі, якая, на маю думку, мае самае непасрэднае дачыненне да разглядаемай тэмы. Ёсць толькі слушныя іх меркаванні аб асобных адмоўных аспектах мясцовага самакіравання. Напрыклад, Аляксандр Чубрык адзначае: «Як мы можам зразумець дух горада, тэрыторыі, калі людзі не маюць уплыву на прыняцце рашэнняў?», а Міхаіл Русы канстатуе наяўнасць «нестыковак мясцовых органаў улады і прадпрыемстваў рэспубліканскай формы ўласнасці». Вядома, хібаў у існуючым сёння законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» значна больш, чым тых, пра якія нагадалі ўдзельнікі круглага стала. Невыпадкова ідзе размова аб яго ўдасканаленні і ўнясенні змяненняў нават у Канстытуцыю Беларусі. На маю думку, гэтым змяненням павінна папярэднічаць аптымізацыя АТП. У якім накірунку яе праводзіць, існуюць розныя меркаванні. Гады два таму я сам выказваўся на гэты конт на старонках «Звязды» і прапанаваў нават схему новага АТП. Важна ўсвядоміць, што пісьменна праведзеная аптымізацыя зробіць непатрэбнай саму пастаноўку пытання аб выдзяленні нейкіх драйвераў. Ужо даўно стала відавочным, што абмежаванасць дэмаграфічнага, сацыяльна-эканамічнага і прыродна-экалагічнага патэнцыялу ў большасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак нізавога ўзроўню, не дазваляе ў поўнай меры рэалізаваць задачы ўстойлівага іх развіцця. Невыпадкова ўзнікае жаданне нейкім чынам падцягнуць, паправіць, палепшыць сітуацыю ў праторавым развіцці краіны. Зразумела, што толькі адно змяненне АТП не можа вырашыць усіх праблем рэгіянальнай дыферэнцыяцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, аднак, не бачыць і таго, што гэтыя працэсы звязаны паміж сабой, таксама нельга.

Думаю, што мае разважанні знойдуць водгук ва ўсіх тых, хто цікавіцца рэгіянальнай праблематыкай.

З павагай і ўдзячнасцю,
кандыдат
геаграфічных навук,
дацэнт Вячаслаў САСНОЎСКІ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Торговый дом «Речицкий» (арендодатель) извещает о проведении 31 марта 2020 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование и адрес лота	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 %	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 %
1	**Помещение площадью 182,5 кв. м**, в изолированном нежилом помещении – помещение, не относящееся к жилищному фонду с инв. № 350/D–263630, помещение на 1-м этаже. **Местонахождение:** г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Арендная плата в месяц – **2499,24 бел. руб.** (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,9**. **Цель использования:** торговля непродовольственными товарами. **Срок аренды – 3 (три) года**	**771,06**	77,11
2	**Помещение площадью 53,5 кв. м**, в изолированном нежилом помещении – помещение, не относящееся к жилищному фонду с инв. № 350/D–263630, помещение на 1-м этаже. **Местонахождение:** г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Арендная плата в месяц – **732,36 бел. руб.** (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,9**. **Цель использования:** торговля непродовольственными товарами. **Срок аренды – 3 (три) года**	**226,04**	22,60

Сведения о продавце	ОАО «Торговый дом «Речицкий», г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (0232) 50-32-71, Пикулина Нина Альбертовна**
Срок подачи заявления	**С 28.02.2020 г. по 27.03.2020 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**. **Подача документов по почте не допускается**
Номер р/с для перечисления задатка	Расчетный счет **Продавца (ОАО «Торговый дом «Речицкий»):** BY56 BLBB 3012 0400 0540 0000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, код банка BLBBBY2X, УНП 400054000, ОКПО 14458671, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)
Размер штрафа	**Лот № 1 – 8 (восемь) базовых величин; лот № 2 – 3 (три) базовых величины**, согласно Указа Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)

Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона): в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), в том числе затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 28.02.2020 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **5 (пяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **3 (трех) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by, раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

30 марта 2020 г. в 10.00 по адресу: Витебская обл., г. п. Россоны, ул. Советская, д. 4, большой зал райисполкома (1-й этаж) состоится открытый аукцион по продаже права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, – личинок хирономид (далее – аукцион, торги)

Предмет торгов	Согласно информации Национальной академии наук Беларуси		Начальная цена предмета торгов	Сумма задатка – 50 % начальной цены
	Промысловый запас биомассы личинок хирономид	Предельно допустимый объем изъятия личинок хирономид в год		
ЛОТ № 1. Право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, – личинок хирономид **на озере Бродно** (площадь 39,5 га) сроком на 5 (пять) лет	40 кг/га	711 кг	**539** (пятьсот тридцать девять рублей)	**269,50** (двести шестьдесят девять рублей 50 копеек)

Организатор аукциона – Россонский районный исполнительный комитет, тел.: 8 (02159) 5 13 74, 8 (02159) 5 61 29.

Порядок проведения торгов устанавливается в соответствии с пунктом 15 Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

К участию в аукционе допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие не позднее чем за три рабочих дня до проведения аукциона заявление об участии в аукционе и заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка.

Размер задатка для участия в аукционе оплачивается до подачи заявления на расчетный счет Россонского районного исполнительного комитета BY03AKBB36040000056332100000 в ЦБУ № 217 г. п. Россоны филиал № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, БИК AKBBBY21216, УНП 300009816, ОКПО 04062995, наименование платежа: задаток для участия в торгах в форме аукциона.

Участнику, выигравшему аукцион, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, изготовление документации, необходимой для его проведения.

В случае отказа или уклонения от подписания протокола, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, а также в иных случаях, предусмотренных законодательством, внесенный задаток возврату не подлежит.

Участнику, не выигравшему аукцион, а также в иных случаях, предусмотренных законодательством, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участник торгов имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем, сумма задатка будет возвращена в течение пяти рабочих дней со дня обращения.

Аукцион проводится путем пошагового увеличения цены лота. Сумма шага аукциона составляет 10 % от начальной цены лота. Выигравшим аукцион признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с подачей на участие в нем только одним участником право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предоставляется этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения, о чем извещает участников торгов.

Протокол о результатах аукциона подписывается в день его проведения в трех экземплярах всеми присутствующими членами комиссии и победителем аукциона и в течение 14 дней представляется для утверждения вместе с проектом решения райисполкома о предоставлении права на заготовку и (или) закупку личинок хирономид в Россонский районный исполнительный комитет.

Победитель аукциона обязан возместить затраты по его организации и проведению в течение трех рабочих дней со дня проведения торгов и оплатить предмет торгов в полном объеме в течение 5 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: Витебская область, г. п. Россоны, ул. Советская, д. 4, кабинет № 51 (отдел экономики райисполкома) в рабочие дни с 8.00 до 17.00 с перерывом на обед с 13.00 до 14.00. **Контактный телефон/факс** 8 (02159) 51374**. Окончательный срок приема заявлений – 24 марта 2020 г. до 17.00.**

В Суд Светлогорского района Гомельской области поступило заявление Красновского сельского исполнительного комитета о признании гражданина Шороп Ивана Николаевича, 25.01.1971 года рождения, уроженца д. Дерновичи Наровлянского района Гомельской области умершим. Последнее известное место жительства д. Красновка Светлогорского района Гомельской области. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Шороле Иване Николаевиче как о гражданине, в отношении которого ставится вопрос об объявлении умершим, сообщить в суд Светлогорского района в двухмесячный срок с момента публикации имеющиеся сведения о данном гражданине. УНП 400015926

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН/2РП серии БЛБ, №1448428, **считать недействительным.**

УНП 100122726.

ДОБРАЯ НАВІНА

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

У аграгарадку Васход Магілёўскага раёна рэканструявалі дзіцячы сад-яслі

У выніку мадэрнізацыі старога будынка, якая была праведзена ўсяго за год з невялікім, плошча ўстановы павялічылася ў паўтара раза. Абноўлены дзіцячы сад сёння можа прыняць 105 выхаванцаў – на трыццаць больш, чым раней. Бацькі і родныя дзяцей у захапленні ад змен: падлога з падагрэвам, харчблок абсталяваны па апошнім слове тэхнікі , зручная пральня, музычная зала. Цалкам змянілася і тэрыторыя вакол дзіцячага садка: зроблены новыя веранды, устаноўлена сучаснае спартыўнае і гульнявое абсталяванне.

– Дзеці – наша інвестыцыя ў будучыню. Таму вельмі важна, каб у іх былі годныя ўмовы для гарманічнага развіцця. Каб бацькі, пакідаючы сваіх малых у дзіцячым садку, ведалі, што ім там камфортна і ўтульна. Што з імі займаюцца клапатлівыя педагогі, якія дапамогуць раскрыць у дзіцяці талент і развіць яго, – адзначыў падчас адкрыцця абноўленай установы **член Савета Рэспублікі, прарэктар МДУ імя Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА.**

Упраўленне камунальнага будаўніцтва (УКБ) Магілёўскага раёна і будтрэст № 17 зрабілі ўсё, каб гэты дом быў цёплым і ўтульным. Дырэктар УКБ Віктар Аляксандраў адзначыў, што ў раёне ёсць яшчэ адзін перспектыўны аграгарадок – Вейна, дзе таксама разглядаецца магчымасць рэалізацыі праекта па будаўніцтве новага дзіцячага садка.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ТЭХНАЛОГІІ НА АХОВЕ ЗДАРОЎЯ

Новае абсталяванне — установам Брэстчыны

Спартыўныя трэнажоры для школы, а таксама медыцынскае абсталяванне атрымалі гэтымі днямі ўстановы Брэстчыны ў межах праграмы ўрада Японіі «Карані травы». Агульная сума сродкаў, якія выдзелены для гэтых мэт, — 166 тысяч долараў.

Сярэдняя школа № 2 Століна стала першай беларускай адукацыйнай установай, праект якой перамог у конкурсе пасольства Японіі ў Беларусі. Школа выйграла грант у памеры 8439 долараў для набыцця спартыўных трэнажораў і інвентару. 26 лютага падчас урачыстай цырымоніі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Хірокі Такунага перадаў набытае абсталяванне школе і павіншаваў з перамогай дырэктара адукацыйнай установы Алу Лазіцкую.

Праз дзень урачыстая цырымонія прайшла ў дзвюх бальніцах Брэсцкай вобласці. Брэсцкая абласная дзіцячая бальніца атрымала новы артраскоп і гастраскоп. Ад урада Японіі медыцынскай установе было пералічана 79 272 долары на закупку гэтага дыягнастычнага абсталявання.

Свой новы гастраскоп, дзякуючы ўдзелу ў праграме, з'явіўся і ў Іванаўскай цэнтральнай раённай бальніцы. На яго закупку ўстанове аховы здароўя выдзелілі 78 365 долараў. Цяпер такое дыягнастычнае абследаванне, як гастраскапія, для жыхароў Іванаўскага раёна стане больш даступнае.

З 2004 года пасольства Японіі ў Беларусі рэалізуе праграму «Карані травы – грантавая дапамога для праектаў па забеспячэнні бяспекі чалавека». Яе асноўная мэта – дапамагчы людзям, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і яе наступстваў. За гэты час рэалізавана 52 праекты, і столькі ж установ, пераважна медыцынскіх, атрымалі магчымасць закупіць новае абсталяванне.

Агульная сума грантаў, выдадзеных з 2004 да 2020 года, складае больш за чатыры мільёны долараў, а колькасць адзінак закупленага абсталявання перавышае 250.

Алена КРАВЕЦ.

ТРАДЫЦЫІ

БРАЦКАЯ СВЯЧА Ў БЕЛАВЕЖСКІМ

Пра цікавую традыцыю, якая толькі нараджаецца ў Белавежскім сельсавеце, расказала старшыня сельвыканкама Жанна ХІЛЮЦІЧ. Напярэдадні свята Грамніц шматлікія прадстаўнікі грамадскасці сабраліся ў нядзельнай школе пры царкве і ўсе разам зрабілі брацкую свячу.

Справа ў тым, што пасёлак Белавежскі шматнацыянальны, тут жывуць выхадцы з многіх рэспублік былога Саюза і людзі з розных куткоў Беларусі. Нямала ёсць перасяленцаў са Століншчыны, дзе падтрымліваецца старадаўні абрад вырабу брацкай свячы.

У маладым пасёлку Белавежскі адносна нядаўна ўзведзены храм у гонар Веры, Надзеі, Любові і маці іх Сафіі. Настаяцель айцец Аляксандр ужо некалькі гадоў праводзіць заняткі ў нядзельнай школе. Бацькі вучняў гэтай установы і сталі галоўнымі ініцыятарамі стварэння ўласнай брацкай свячы. На белавежскую свечку пайшло 27 кілаграмаў воску.

Зрабіць свечку, несумненна, трэба ўмець. Гэта справа рук мужчын, як таго патрабуюць старадаўнія звычаі. Да мерапрыемства рыхтаваліся, чыталі патрэбную літаратуру, шукалі звесткі ў інтэрнэце. Галоўнае, захоўваць паслядоўнасць дзеянняў. «Жанчынам у нас даверылі размінаць воск у вёдрах, – расказала Жанна Хілюціч. – І вельмі радаваліся, калі свечка атрымалася прыгожай і роўнай». Завяршэнне работы адзначылі агульным чаяваннем.

Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, такія агульныя справы з глыбокім духоўным зместам служаць умацаванню сяброўскіх сувязяў вяскоўцаў. Людзі выходзілі з нядзельнай школы нібы прасветленыя, усе ўсміхаліся адно аднаму.

А на свята Стрэчання свечку ўнеслі ў храм, асвяцілі. Цяпер яе будуць запальваць кожную службу, брацкай свячы павінна хапіць на два гады.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 27 лютага 2020 года.